**Аляксандр Пухоўскі**

# Да пытання лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы

**Аляксандр Пухоўскі**

# Да пытання лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы

Мінск
«Бонэм»
2006

УДК94(476)
ББК63.3(4Беи)
П90

Рэцэнзент
доктар гістарычных навук
*Г.В. Штыхаў*

**Пухоўскі А.Ц.**

П90 Да пытання лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы. / Аляксандр Пухоўскі. – Мінск, "Бонэм", 2006. – с. 40.

ISBN 985-6630-18-5

Па пытанню лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы існуе шэраг канцэпцый. Аналіз іх, асабліва ў частцы аргументацыі, дазваляе вызначыць тую канцэпцыю, якая адпавядае рэчаіснасці і, такім чынам, палажыць канец спрэчкам па згаданаму пытанню.

**УДК94(476)**
**ББК63.3(4Беи)**

**ISBN 985-6630-18-5**

© Пухоўскі А.Ц.

# 1. Уступ

Пытанню лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы надавалі ўвагу шмат гісторыкаў. Ад адказу на пытанне: "Дзе была памянёная Літва?" – залежаць адказы на шэраг важных праблемаў гісторыі Верхняга Панямоння і не толькі яго. М.Ермаловіч лічыў, што з заблытвання гэтага пытання пачынаецца і заблытванне гісторыі ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага [1].

Амаль да канца XX стагоддзя панавала думка, паводле якой старажытная Літва знаходзілася ў арэале культуры ўсходне-літоўскіх курганоў, пераважна на тэрыторыі сучаснай Летувы.

Згаданая думка ўпісвалася ў так званую балцкую канцэпцыю ўтварэння і гісторыі ВКЛ.

У 1989 г. выйшла з друку праца Міколы Ермаловіча "Па слядах аднаго міфа", адзін раздзел якой быў прысвечаны лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы. М.Ермаловіч, абапіраючыся на летапісныя паведамленні, хронікі і тапанімічныя дадзеныя, прыйшоў да высновы, што яна знаходзілася на тэрыторыі сучаснай Беларусі, паміж гарадамі Менскам і Навагародкам, Маладзечнам і Слонімам.

Канцэпцыя М.Ермаловіча атрымала крытыку з боку летувіскага гісторыка Э.Гудавічуса і некаторых яго беларускіх калег. М.Ермаловіч чамусьці не даў адказу на іх крытычныя заўвагі, тым больш што жадання пакрытыкаваць было куды больш, чым падстаў для гэтага. Пасля заўчаснай гібелі М.Ермаловіча пакінутая па сутнасці без адказу крытыка Э.Гудавічуса спрычынілася да таго, што ў гістарычных колах пачала ўсталёўвацца думка пра памылковасць яго канцэпцыі.

Таму наспела неабходнасць звярнуцца да гэтага пытання і падрабязна разгледзець аргументы М.Ермаловіча, контраргументы і заўвагі яго апанентаў. Акрамя таго, неабходна крытычна падыйсці да ўсіх канцэпцый лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы, асабліва ў частцы іх абгрунтавання, тым больш што крытыкай закранался толькі канцэпцыя М.Ермаловіча.

Перад разглядам заяўленай тэмы зробім некалькі заўваг па тэрміналагічных і іншых пытаннях:

– Паводле Э.Гудавічуса, тэрмін "Літва" ў крыніцах XII–XIII стст. ужываецца ў двух значэннях: для назвы асобнага балцкага племені і яго зямлі, а таксама для абазначэння сукупнасці балцкіх земляў [2]. Такая двухсэнсоўнасць тлумачыцца як слабой дасведчанасцю аўтараў у племянных падзелах балтаў, так і палітычнымі прычынамі [3].

– Складаныя тэрміны "старажытная Літва", "летапісная Літва", "Літва ў вузкім сэнсе", "уласна Літва" і іншыя ўжываюцца аўтарамі для вылучэння згаданага асобнага племяні і яго зямлі з сукупнасці іншых балцкіх плямёнаў.

– А.Краўцэвіч прыкмеціў змену сэнсу тэрміна "Літва" у галіцка-валынскім летапісе ад этноніма да хароніма. Далей ён даводзіць, што "летапіс аднachасова ўжывае тэрмін у абодвух значэннях. Пры апісанні ўнутраных спраў Панямоння ўсходне-славянскія гарады-землі аддзяляюцца ад Літоўскай зямлі. Калі ж гаворка ідзе ўвогуле пра Сярэдняе Панямонне (многія аўтары звязваюць Навагародскую зямлю з Верхнім Панямоннем. – А.П.), то ўсё яно называецца Літвой.

У 1249–50 гг. валыняне ідуць на Літву, а канкрэтна – на Новагародак. Пры апісанні паходу на 1252 г. ужо адназначна Новагародак атаясамліваецца з Літвой: "на Літву на Новагародак". Пад 1256 г. летапіс паведамляе, што Войшэлак са Шварнам княжаць у Літве, а высвятляецца, што Шварн сядзіць у Новагародку. Падчас зімняга паходу 1277 г. валынскія князі зноў ідуць на Літву, а тут жа ўдакладняюцца канкрэтныя месцы – Новагародак і Гародня.

А вось прыклады аддзялення Літвы ад Новагародка. Войшэлак будуе манастыр паміж Новагародкам і Літвой. Войшэлак збірае войска Новагародка і ідзе княжыць у Літву. У 1275 г. валыняне, узяўшы вакольны горад Новагародка, збіраюцца потым ісці на Літву.

Магчыма, традыцыя называць Літвой тэрыторыю Сярэдняга Панямоння – зону змешанага насельніцтва сягае каранямі яшчэ да XI–XII стст., але канчаткова гэтая назва ўсталявалася відавочна з утварэннем ВКЛ" [4].

З заўвагай А.Краўцэвіча пераклікаецца І.Ласкоў: "Узнікае пытанне, чаму тады новастворанaя дзяржава атрымала назву Вялікага Княства Літоўскага? Прычына, мабыць, у тым, што ў папярэднія часы арэал Літвы быў значна шырэйшы і Новагародак быў заснаваны на ейных землях. Паколькі славяне прыйшлі сюды толькі ў сярэдзіне XI ст. (1044 г.), то да сярэдзіны XIII ст. памяць пра тое, што тут даўней жыла літва, была яшчэ жывая. Тым менавіта і тлумачацца цесныя сувязі паміж Новагародкам ды Літвой з запрашэннямі літоўскіх князёў на Новагародскі пасад і той факт, што ў свядомасці сучаснікаў, як паказвае Іпацьеўскі летапіс, паняцці Новагародак ды "Літва" часта зліваліся" [5].

Калі ў XI і XII стст. Новагародскую зямлю суседзі называлі Літвой, то гэта хутчэй за ўсё ідзе ад таго, што, як лічыць І.Ласкоў, тут раней жыла літва, а не таму, што змяняўся акцэнт тэрміна ад этноніма да хароніма. Харонім "Літва" азначае гістарычны цэнтр, тэрытарыяльнае ядро дзяржавы. У XI–XII стст. у Верхнім Панямонні дзяржава пад найменнем

Літва яшчэ не існавала, таму ў тыя часы тэрмін "Літва" не мог набываць сэнс хароніма. Вялікае Княства Літоўскае было створана пазней, у сярэдзіне XIII ст. Калі мець на ўвазе натуральны кансерватызм у змене сэнсу тэрмінаў і незацікаўленасць галіцка-валынскіх князёў у стварэнні новай дзяржавы, то наданне тэрміну "Літва" сэнсу харонімa ў галіцка-валынскім летапісе адбылося значна пазней часу стварэння ВКЛ, магчыма, у першай палове XIV ст.

– Першым, хто выказаў думку аб знаходжанні старажытных літоўскіх земляў на тэрыторыі сучаснай Беларусі, быў расійскі навуковец А.Качубінскі. Ён у канцы XIX ст., абапіраючыся на лінгвістычны аналіз тапонімаў і гідронімаў на тэрыторыі Мінскай губерні, даводзіў, што "озёра, реки свидетельствуют о литовском некогда этнографическом характере центральной белорусской области – Минской губернии, вскрывают перед нами литовскую физиономию грандиозного края болот из эпохи доисторической... Белорусский край – славянский, но крещен от литовца; литовец был некогда хозяином и в болотах Припяти, и на востоке к Днепру, к устью Березины ... территория доисторической Литвы границами своими имела бы: с юга северный бассейн Припяти, с востока – бассейн Березины, а с запада – верховье Нарева, а пожалуй, и Западного Буга" [6].

Зразумела, што тут А.Качубінскі літоўцамі называе не толькі ўласна літоўцаў, але і іншых балтаў: лотву і яцвягаў, якія ў сукупнасці займалі ў свой час амаль усю тэрыторыю былой Менскай і частку Гродзенскай губерняў.

Пазнейшыя даследаванні археолагаў В.Сядова [7] і Я.Зверугі [8] пацвердзілі вывады А.Качубінскага, і тэза пра першаснае засяленне балтамі згаданых земляў набыла важкія доказы.

– Тэксты летапісу, якія сустракаюцца ў аўтарскім каментары, прыведзены ў перакладзе на сучасную рускую мову паводле зборніка "Памятники литературы Древней Руси XIII в." пад рэдакцыяй Л.Дзмітрыева і Д.Ліхачова.

# 2. Канцэпцыі лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы

Разгледзім памянутыя канцэпцыі і цікавы для нас фрагмент Дублінскага летапісу пераважна ў храналагічнай паслядоўнасці іх публікацый.

## 2.1. Меркаване М.Любаўскага пра "ўласную Літоўскую зямлю"

У 1892 г. ў працы "Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства" М.Любаўскі закрануў пытанне лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы. Паводле яго, "ядром, з якога вырасла і развілася Літоўска-Руская дзяржава, вакол якога групіраваліся ўсе іншыя яе часткі, была ўласна Літоўская зямля, або вялікае княства ў цесным сэнсе.

Першапачаткова пад гэтым іменем разумелася вобласць правых прытокаў Нёмана, пераважна р. Віліі, населеная так званай "верхняй літвой" (Auxtote)" [9].

Зразумела, што згаданае паведамленне не з'яўляецца канцэпцыяй рассялення літвы ў старажытнасці. Яно цікава для нас тым, што тут упершыню ужыты складаны тэрмін "уласна Літоўская зямля", які ў пазнейшых аўтараў замацаваўся за зямлёй старажытнага племені літвы, нягледзячы на тое, што М.Любаўскі ўжыў яго да іншай тэрыторыі, да тэрыторыі Аўкштайціі, якая, ў сваю чаргу, складалася з земляў Нальшанаў, Дзяволтвы і, магчыма, Упітэ.

## 2.2. Канцэпцыя Г.Лаўмянскага

Найбольш распаўсюджанай і прынятай шырокім колам гісторыкаў з'яўляецца канцэпцыя Г.Лаўмянскага, паводле якой старажытная Літва знаходзілася ў міжрэччы Нёмана і Віліі, на тэрыторыі былога Трокскага княства [10] (гл. карту). Сваю версію Г.Лаўмянскі аргуменціруе звесткамі з Рыфмаванай Хронікі і Іпацьеўскага летапіса. Разгледзім фрагменты са згаданых крыніц, якія, на думку Г.Лаўмянскага, даюць яму падставы лакалізаваць старажытную Літву ў вызначаным ім месцы. Тэксты фрагментаў Рыфмаванай Хронікі даюцца ў перказе Г.Лаўмянскага з яго працы "Studia nad poczatkami spoleczenswa i panstwa Litewskiego", том II.

– "Нальшанская зямля цягнулася ад інфлянцкага памежжа ў глыб Літвы, аж да зямлі, якая знаходзілася на левым беразе Віліі і не мела ў крыніцах сваёй назвы, а акрэслена была папросту як "Літва", "зямля Літоўская" менавіта ў цесным сэнсе" [11]. Гэты фрагмент супярэчлівы па зместу. Спачатку паведамляецца, што зямля (на левым беразе Віліі) не мае

уласнай назвы, а ў канцы гэтай зямлі надаецца ўласная назва "Літвы ў цесным сэнсе". Складаны тэрмін "Літва ў цесным сэнсе" быў уведзены ў навуковы абарот М.Любаўскім у 1892 г. [12], значна пазней часу стварэння Рыфмаванай Хронікі. Гэта азначае, што словы "менавіта ў цесным сэнсе" не адносяцца да тэксту Хронікі. З нейкай ступенню ўмоўнасці іх можна разглядаць як каментар Г.Лаўмянскім згаданага фрагмента Рыфмаванай Хронікі. Калі гэта каментар, то таксама нічога станоўчага не атрымліваецца таму, што адсутнасць у крыніцах уласнай назвы нейкай зямлі – яшчэ не дастатковая падстава надаваць ёй адвольна нейкую ўласную назву і лічыць гэтую адвольную назву аргументам у тых ці іншых спрэчках.

– Як лічыць Г.Лаўмянскі, паводле Іпацьеўскага летапіса сталіцай дамена Міндоўга з'яўляецца г.Варута. Існуе шэраг гіпотэз па лакалізацыі сталіцы Міндоўга. Найбольш пераканаўчай для Г.Лаўмянскага з’яўляецца гіпотэза Каллмейера, паводле якой Варута знаходзілася на месцы г. Кернава [13]. Але сам Г.Лаўмянскі адзначае, што гіпотэзе Каллмейера супярэчыць Рыфмаваная Хроніка. Апісваючы паход лівонскага войска супраць Міндоўга ў 1250 г. (галіцка-валынскі летапіс адносіць гэты паход да 1252 г. – А.П.), храніст заўважыў, што да канца XIII ст. нага крыжацкага жаўнера не ступала па яго (Міндоўга) зямлі, акрамя аднаго разу – ў 1250 г. [14]. Але ў 1278 г., паводле той самай Хронікі, інфлянцкія крыжакі арганізавалі паход супраць Тройдзена і дайшлі да Кернава (на правым беразе Віліі), а край спустошылі. З гэтага вынікае, піша Г.Лаўмянскі, што "Сталіца Міндоўга, а з ёю і "зямля Літоўская ў цесным сэнсе” мусілі знаходзіцца на левым беразе Віліі" [15]. Застаецца толькі заўважыць: смеласць гэтага вываду не адпавядае яго абгрунтаванасці.

– Цікавым з’яўляецца наступны фрагмент Рыфмаванай Хронікі і яго каментар Г.Лаўмянскім. "Ландмайстар Андрэй Сцірланд у 1250 г. выступіў супраць Міндоўга на чале агромнай арміі, каторая па дарозе запускала загоны ў Нальшанскую зямлю, і, пасля спусташэння гэтага края, паспяшыла ў страявым парадку "durch Nalsen kein Littowen", або да Літвы ў цесным сэнсе, дзе Міндоўг зачыніўся ў сваім горадзе Варуце" [16].

Але "kein" – адмоўе, таму "durch Nalsen kein Littowen" перакладаецца не "да Літвы", як гэта лічыць Г.Лаўмянскі, а "праз Нальшаны за межы Літвы, па-за Літву і гэтак далей".

Разгледзім магчымы шлях лівонскага войска па тых нешматлікіх звестках, якія ўтрымлівае Рыфмаваная Хроніка. Трэба думаць, што свой шлях да Варуты Міндоўга войска пачало з раёну Дынабурга, бо апошні знаходзіўся бліжэй, чым астатнія раёны Інфлянтаў, да мэты паходу. Па дарозе, як паведамляе Рыфмаваная Хроніка, войска запускала загоны ў Нальшанскую зямлю. Атрымліваецца: асноўны састаў войска рухаўся прыкладна ўздоўж ці то паўночна-заходняй мяжы Нальшанаў, ці то паў-

днёва-усходняй мяжы (гл. карту). Але тая акалічнасць, што пасля спусташэння Нальшанаў войска перасекла іх і апынулася за межамі Літвы, выключае яго рух уздоўж паўднёва-усходняй мяжы. Перасякаючы Нальшаны з паўднёва-усходняй мяжы, войска апынулася б не па-за Літвой, а ў Літве, прыкладна ў раёне Вільня – Кернаў. Гэта тэрыторыя ў разгледжаным раней фрагменце Рыфмаванай Хронікі называлася "папросту Літвой, зямлёй Літоўскай".

Такім чынам, войска на шляху да Варуты Міндоўга рухалася ўздоўж паўночна-заходняй мяжы Нальшанаў, недзе ў раёне Вільні павярнула і перасекла іх. Далей войска рухалася не да Кернава, як лічыць Г.Лаўмянскі, а ў процілеглым кірунку, ад Кернава туды, дзе знаходзілася сталіца Міндоўга г.Варута.

Такім чынам, размяшчэнню Варуты і "зямлі Літоўскай у вузкім сэнсе", паводле Г.Лаўмянскага, Рыфмаваная Хроніка пярэчыць другі раз, што дастаткова, каб лічыць гэтае меркаванне памылковым.

– Э.Гудавічус у артыкуле "Літва Міндоўга" прыводзіць, на яго думку, дадатковыя аргументы на карысць гіпотэзы Г.Лаўмянскага. Яны, як ён піша, абапіраюцца на Іпацьеўскі летапіс, археалагічныя і дыялекталагічныя матэрыялы.

Спачатку разгледзім фрагмент з Іпацьеўскага летапіса, у якім Э.Гудавічус заўважыў аргумент на карысць гіпотэзы Г.Лаўмянскага. "В год 6751 (1253) Тевтивил прислал к Даниилу Ревбу сказать: "Пойди к Новогрудку". И Даниил пошел с братом Васильком и сыном Львом, и с половцами, и со сватом своим Тегаком, и пришел к Пинску. Князья Пинские таили обман, их взяли с собой на войну неволей. Литовцы послали сторожевые отряды на озеро Зъяте, и они прошли через болота до реки Щарьи. Когда все полки соединились, созвали совет и сказали: "О нас уже известно". И воины препирались – не хотели идти воевать. Даниил же сказал им мудрое слово: "Стыдно нам перед Литвой и остальными землями, если мы не дойдем и вернемся. Завтра, – сказал он, – устроим совет". Той же ночью он послал ко всем воинам, говоря: "Пойдите, пусть увидят это все те, кто не хочет идти на войну". И видя воинов, которые пошли, и другие воины пошли поневоле. И уже утром они захватили всю землю Новогородскую. Оттуда же возвратились домой. Ятвяги поехали на помощь Даниилу, но не могли проехать, потому что выпал большой снег. Оттуда они вернулись с Божьей помощью, захватив много пленных.

Потом послал Даниил с братом своим и с сыном своим Романом своих людей, и взяли они Городен, а сами вернулись от Бельска. Потом Даниил послал много своих пеших воинов и всадников на их города, и они захватили все их вотчины и области" [17].

Паведамленне з Іпацьеўскага летапіса Э.Гудавічус каменціруе наступным чынам: "Апісваючы вайну паміж Галічам і Літвой зімой 1251–52 гг. (у летапісу вайна паміж Галіцка-Валынскай і Новагародскай землямі ў 1253 г.), Іпацьеўскі летапіс абмяжоўвае тэатр ваенных дзеянняў р.Шчарай і Новагародкам; аперацыйнай базай наступаючых галіцкіх войскаў з'яўляўся г.Бельск. Галіцкае войска захоплівае Гародню і нарэшце ўрываецца ў вотчыну (дамен) Міндоўга, падыходзіць да яго замка... Звернем увагу на характар галіцкіх аперацый: гэта серыя кароткіх udараў без вялікага адрыву ад тылу. Пры такім палажэнні цяжка ўявіць, што набег на вотчыну Міндоўга, якая знаходзілася дзесьці далей, чым узятая Гародня і не узяты Новагародак, дасягнуў глыбіні літоўскай тэрыторыі. Тут магчыма весці гаворку толькі пра суседнія літоўскія вобласці, г.зн. пра паўднёвую Літву... Сказана нават вельмі многа: магчыма з упэўненасцю гаварыць пра арэал, у якім (або частцы якога) знаходзіліся паўднёвыя межы дамена Міндоўга: гэта наваколле Меркіне, Даўгай, Варэны, Ліды. Пытанне аб астатніх яго межах пакуль што застаецца адкрытым" [18].

Па каментару Э.Гудавічуса ўзнікае шэраг пытанняў:

– Чаму тэатр ваенных дзеянняў абмежаваны р.Шчарай і Новагародкам, калі Гародня, якая была захоплена галіцка-валынскім войскам, знаходзіцца не на азначанай прасторы?

– Чаму Бельск, які знаходзіцца ў заходнім кірунку ад Новагародскай зямлі, лічыцца аперацыйнай базай, калі войска рухалася ў Новагародскую зямлю праз Пінск з поўдня?

– Чаму ўся ваенная аперацыя насіла характар серыі кароткіх udараў? Мы не ведаем, з якой тэрыторыі быў сабраны "вялікі палон", таму немагчыма вызначыць, вынікам кароткага ўдару гэта было, ці не.

– Мы не ведаем, адкуль галіцка-валынскае войска пайшло на Гародню.

– Мы не ведаем, адкуль яно пайшло ў вотчыну Міндоўга.

На ўсе гэтыя пытанні мы не знойдзем адказу ў Э.Гудавічуса, таму яго версія пра аперацыйны цэнтр і серыю кароткіх udараў з'яўляецца цалкам надуманай і не мае падстаў на існаванне.

Але на хвіліну пагодзімся з гэтай версіяй. Да серыі кароткіх udараў Э.Гудавічус адносіць і паход у вотчыну Міндоўга, паўднёвыя межы якой ён вызначыў у наваколлі Меркіне, Варэны, Даўгай і Ліды. Калі адлегласць ад Бельска да памянёных гарадоў упісваецца ў формулу кароткіх udараў, то ўзнікае пытанне, чаму менавіта паўднёвая мяжа размешчана ў наваколлі гэтых гарадоў? Чаму яна не можа знаходзіцца на той жа адлегласці ад Бельска, але у іншым месцы? Калі на карце з г.Бельска правесці дугі, радыус якіх адпаведны адлегласцям ад памянёных гарадоў да Бельска, то ўсе дугі пройдуць і праз тэрыторыю Літвы паводле М.Ермаловіча. Гэта азна-

чае, што і на тэрыторыі Літвы М.Ермаловіча магла знаходзіцца вотчына Міндоўга.

Такім чынам, версія Э.Гудавічуса пра аперацыйны цэнтр і серыю кароткіх udaraў, якая павінна была служыць падставай для вываду аб месцы знаходжання паўднёвай мяжы вотчыны Міндоўга, не дае адназначнага адказу. Увогуле меркаванне Э.Гудавічуса пра паўднёвыя межы дамена Міндоўга ў наваколлі Меркіне, Даўгай, Варэны і Ліды ўзнікла невядома адкуль. Крыніца, на якую спасылаецца аўтар, не ўтрымлівае інфармацыі для такога вываду. Ці трэба казаць, што такі адвольны падыход да зместу крыніц дазваляе ўбачыць аргументы на сваю карысць нават там, дзе іх ніколі не было.

Паводле археалагічных матэрыялаў, на якія спасылаецца Э.Гудавічус, археолагі А.Лухтан і В.Ушынкас выказаліся так: "Нельзя не отметить, что к археологическим материалам обращаются и историки, однако специфика археологических источников затрудняет их привлечение в качестве исторического материала. Наглядным примером может служить приводимая Э.Гудавичюсом археологическая аргументация для подтверждения гипотезы Г.Ловмянского о юго-восточном (к югу от Няриса) центре консолидации Литвы. Подобранные автором данные из археологического атласа Литвы представляют собой подборку разновременных памятников, зачастую не исследованных, не связанных с рассматриваемой территорией, а в ряде случаев принадлежащих различным племенным группам и, таким образом, не способных служить основой для определения территории Литовской земли" [19].

Мяжа паміж сучаснымі ўсходнімі і паўднёвымі дыялектамі, на якую спасылаецца Э.Гудавічус, праходзіць па сярэдняму цячэнню Нярыса (Віліі) і далей у тым жа паўднёва-усходнім кірунку да населенага пункту Дзевянішкіс [20]. Э.Гудавічус піша: "Рызыкоўна толькі на падставе археалагічных і дыялекталагічных дадзеных вызначаць мяжу паміж Нальшай і "Літвой у вузкім сэнсе", але, будучы далучанымі да матэрыялаў крыніц XIII ст., гэтыя дадзеныя дазваляюць вызначыць хоць бы прыблізнае ўяўленне аб арэале, дзе яе трэба шукаць – раён цячэння Нярыса" [21].

Што можна вызначыць з крыніц XIII ст., на якія абапіраліся Г.Лаўмянскі і сам Э.Гудавічус, мы разгледзелі вышэй. Што можна вызначыць з археалагічных крыніц, разгледзелі А.Лухтан і В.Ушынкас. Таму застаецца вызначаць мяжу толькі на падставе дыялекталагічных дадзеных, што, паводле самога Э.Гудавічуса, рызыкоўна. Але калі мець на ўвазе, што дыялекталагічная мяжа па Нярысу праходзіць не паміж Нальшай і Літвой (паводле Г.Лаўмянскага), а на ўчастку ад Нярыса (Віліі) да населенага пункту Дзевянішкіс, нават перасякае тэрыторыю Нальшы, то згаданая рызыка павялічваецца шматкроць.

Можна лічыць, што аргументацыя канцэпцыі Г.Лаўмянскага як аўтарам, так і яго аднадумцам Э.Гудавічусам не вытрымлівае ніякай крытыкі і па сваёй сутнасці гэтакай не з'яўляецца. Тое, што згаданая канцэпцыя больш як 70 гадоў з'яўляецца аўтарытэтнай для шырокага кола гісторыкаў, ёсць рэдкі кур'ёзны факт.

## 2.3. Канцэпцыя А.Лухтана і В.Ушынскаса

А.Лухтан і В.Ушынскас для абгрунтавання лакалізацыі старажытнай Літвы ў арэале культуры ўсходне-літоўскіх курганоў прыводзяць чыста археалагічную аргументацыю. Паводле іх, тэрытарыяльнае адзінства арэала, на якім пазней узнікла "Літоўская зямля", фіксуецца ўжо на апошніх фазах развіцця культуры штрыхаванай керамікі, што, магчыма, з'яўляецца вынікам эканамічнага патэнцыялу гэтай тэрыторыі.

Згаданая тэрыторыя яшчэ больш абасобілася ў часы ўзнікнення і развіцця культуры ўсходне-літоўскіх курганоў. У археалагічных матэрыялах заўважаны прыкметы ўзнікнення тэрытарыяльнай абшчыны, з'яўлення маёмаснай дыферэнцыяцыі і выдзялення племяннай знаці.

Дынамічнае развіццё культурных з'яў дазваляе меркаваць пра наяўнасць у басейне р.Нярыса племяннога культавага цэнтра.

Глыбокія сацыяльна-эканамічныя змены ва ўсходняй Літве адбываліся на рубяжы I–II тысячагоддзяў н.э. У гэты час пачалося развіццё раннефеадальных адносін і ўзнікалі феадальныя цэнтры, адбывалася станаўленне дружыннай арганізацыі.

Ядром фарміраваўшайся Літоўскай зямлі правамерна лічыць Вільнюс – адносна буйны гандлёвы цэнтр, магчыма ўзнікшы на месцы старога племяннога цэнтра.

Аналіз усяго археалагічнага матэрыялу (клады, каменная забудова, розначасовыя драўляныя насцілы, мясцовая грашовая сістэма) паказвае на тое, што ў XIII ст. Вільнюс быў буйнейшым феадальным замкам Літвы, важным палітыка-адміністрацыйным і эканамічным цэнтрам і, бадай, буйным горадам таго часу, што дазваляе лічыць яго найбольш верагоднай сталіцай Міндоўга" [22].

Археалагічны матэрыял, якім аперыруюць А.Лухтан і В.Ушынкас, дазваляе прасачыць эканамічнае і сацыяльнае развіццё тэрыторыі, якая акрэсліваецца культурай усходне-літоўскіх курганоў. Тое, што Вільня (у аўтараў Вільнюс) была буйным горадам у XIII ст., археалогія вызначае пераканаўча.

Але чаму згаданую тэрыторыю аўтары называюць Літоўскай зямлёй? На якой падставе? Аўтары пра гэта не даводзяць. Далей, ці дастаткова быць буйным горадам і важным палітыка-адміністрацыйным цэн-

трам, каб аўтаматычна стаць сталіцай Міндоўга Варутай? Нагадаем, што ў тыя часы Міндоўг быў не адзіным князем у балцкіх землях. Таму Вільня магла належаць і іншаму князю, не кажучы ўжо пра тое, што ёсць звесткі пра Вільню як рускі горад [23]. Гэтая выключна археалагічная аргументацыя не дае адказу на пытанні: чыя была згаданая зямля, чыя была Вільня?

На недахопы гэтай аргументацыі ўказвае і А.Краўцэвіч. Паводле яго, "галоўным недахопам гэтай чыста археалагічнай рэканструкцыі з'яўляецца пэўная супярэчнасць з пісьмовымі крыніцамі. Літоўская зямля тут цалкам паглынула Нальшаны і Дзяволтву, якія ў пісьмовых крыніцах выступаюць на адным узроўні з Літвой" [24].

Да гэтага можна дадаць, што паведамленне Рыфмаванай Хронікі пра паход лівонскага войска ў 1250 г. выключае Вільню з шэрагу прэтэндэнтаў на сталіцу Міндоўга.

## 2.4. Дублінскі летапіс

У 1979 г. ў амерыканскім часопісе "Speculum" ("Люстра") была апублікавана невядомая крыніца па гісторыі і геаграфіі Еўропы XIII ст. Публікацыя належыць амерыканскаму навукоўцу М.Колкеру. Частка гэтай крыніцы і пасляслоўе да яе В.Чамярыцкага былі змешчаны ў часопісе "Спадчына" [25].

Паводле В.Чамярыцкага публікацыя крыніцы М.Колкерам ажыццёўлена з рукапісу, які захоўваецца ў бібліятэцы Ангельскага ўніверсітэта ў Дубліне.

Для нас найбольшую цікавасць выклікаюць змешчаныя ў Дублінскім летапісе гістарычныя і геаграфічныя звесткі пра Ўсходнюю Еўропу і наш край, тым больш што аповед вядзецца не паводле пераказаў, чутак і паданняў, а непасрэдным сведкам і ўдзельнікам падзей свайго часу хрысціянскім місіянерам-падарожнікам, які жыў і працаваў у сярэдзіне XIII ст.

Геаграфічнае апісанне нашых і сумесных земляў падаецца ў летапісе наступным чынам:

"(5.) Да Венгрыі (Hungarie) з паўночнага боку прымыкае частка ўсходняй Польшчы (Polonie), за якой размешчана Прусія (Pruscia), якая таксама на поўначы даходзіць да Салодкага (Балтыйскага) мора. Яе пачаў схіляць (у хрысціянства) богаўгодны муж Хрыстыян, першы біскуп гэтай зямлі з закону цыстэрыяў, без мяча, а праз ласку хрышчэння.

(6.) З захаду ад яе размешчана вялікая частка Польшчы, прыморская ад поўначы. Яна называецца Памеранія.

(7.) З усходу ж, у кірунку Русі (Russian), да яе далучаецца Яцвезь (Jetwesya). Яе пачаў хрысціць я з таварышам. За Прусіяй на поўнач ад

гэтага народа ляжыць Самбія (Zambia). Яна нібыта прыморская з паўночнага боку...

(10.) Да Самбіі далучаецца Курляндыя, якая больш схіляецца да поўначы, атачоная морам з паўднёвага, а таксама з заходняга боку. А з усходняга краю размешчана зямля паганцаў, якая называецца Жамойць (Samoita). Тут ніколі не прапаведавалася без мяча.

(11.) Таксама на ўсход ад яе ляжыць сумесная з Руссю зямля Летавія (Lectavie), першы кароль якой Міндоўг быў хрышчаны і пры каранацыі прыняў сваё каралеўства ад рымскага пасаду пры маёй там бытнасці".

Першае, на што трэба звярнуць увагу, гэта на разыходжанні паміж інфармацыяй у Дублінскім летапісе і ў сучасных картах, якія тычацца размяшчэння балцкіх земляў у раннім Сярэднявеччы. Напрыклад, паводле карты "Балты в начале 13 в." [26] Жамойць размешчана ў паўночна-ўсходнім кірунку ад Самбіі замест усходняга кірунку паводле летапіса; Курляндыя аддзелена ад Самбіі Жамойцю, а ў летапісе яна мяжуе з Самбіяй.

Такім чынам, адна з крыніц утрымлівае недакладную інфармацыю. Гэтай крыніцай хутчэй за ўсё будзе Дублінскі летапіс, таму што сучасныя карты не могуць утрымліваць памылкі такога кшталту. У гэтай сітуацыі ўзнікае пытанне, ці даставерная інфармацыя пра знаходжанне Літвы ва ўсходнім кірунку ад Жамойці.

Далей, што меў на ўвазе аўтар летапіса пад тэрмінам "зямля Летавія": зямлю старажытнай Літвы або сукупнасць іншых балцкіх земляў? Аўтары таго часу, і не толькі таго, часта называлі разнастайныя балцкія землі літоўскімі, пра што згадвалася ў пачатку артыкула.

Зразумела, існуе гіпатэтычная магчымасць таго, што аўтар летапіса тут не памыліўся, што ён меў на ўвазе тэрыторыю старажытнай Літвы. З тэкста летапіса нельга вызначыць, так гэта ці не. Таму паведамленне Дублінскага летапіса нельга лічыць надзейным аргументам на карысць лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы ва ўсходнім ад Жамойці кірунку.

Але В.Чамярыцкі лічыць, што Літва знаходзіцца ва ўсходнім ад Жамойці кірунку і што гэта, на яго думку, пацвярджаецца старажытнарускім летапісам. Тут В.Чамярыцкі не ўдакладняе, што для яго Літва: гэта старажытная Літва або сукупнасць іншых балцкіх земляў? Што тычыцца старажытнай Літвы, то ні адзін рускі летапіс не ўтрымлівае інфармацыі аб знаходжанні яе ва ўсходнім ад Жамойці кірунку. Бліжэйшая да гэтага месца лакалізацыя старажытнай Літвы ўтрымліваецца ў Іпацьеўскім [29] і Густынскім [66] летапісах, паводле якіх яна знаходзіцца ў раёне Менска, Заслаўя і Навагародка. Але гэты рэгіён знаходзіцца не ва ўсходнім, а ў паўднёва-усходнім кірунку ад Жамойці.

## 2.5. Канцэпцыя М.Ермаловіча

Як згадвалася ў пачатку артыкула, М.Ермаловіч, абапіраючыся на летапісныя паведамленні, нямецкую хроніку і тапанімічныя дадзеныя, прыйшоў да высновы, што тэрыторыя старажытнай Літвы знаходзілася не ў арэале культуры ўсходне-літоўскіх курганоў, як гэта сцвярджаюць усе астатнія аўтары, а на тэрыторыі сучаснай Беларусі, паміж гарадамі Менскам і Новагародкам, Маладзечнам і Слонімам.

Ніжэй мы разгледзім аргументы М.Ермаловіча пераважна ў той паслядоўнасці, якую абраў аўтар. Паколькі канцэпцыя М.Ермаловіча крытыкавалася і гэтая крытыка тычылася галоўным чынам аргументацыі, то пры разглядзе кожнага яго аргумента будуць разгледжаны таксама контраргументы і заўвагі апанентаў.

1. М.Ермаловіч: "Іпацьеўскі летапіс пад 1159 г. паведамляе, што мінскі князь Валадар Глебавіч "ходяше под Литвою в лесех", а пад 1162 г. ён жа выступіў на свайго праціўніка "с Литвою". Адсюль бачна, што Літва знаходзілася па суседству з Мінскім княствам. Да такой самай высновы, грунтуючыся на тых жа летапісных звестках, прыйшоў і А.Насонаў [27].

Э.Гудавічус: "Каб быць саюзнікам Літвы, неабавязкова быць яе суседам [28].

Каментар: Слушная заўвага, але яна не адмаўляе сітуацыі, пры якой суседзі адначасова з'яўляюцца і саюзнікамі, а згаданае летапіснае паведамленне можна разглядаць як ўскоснае сведчанне знаходжання Літвы недалёка ад Менскага княства.

2. М.Ермаловіч: "Тэрыторыю, якая ляжала на захад ад Мінска, як Літву паказвае, але ужо з боку Новагародка (і гэта асабліва каштоўна), запіс Іпацьеўскага летапісу пад 1262 г. Паведамляецца, што князь Войшэлак "учини собе монастырь на реце на Немне, межи Литвою и Новымгородком". Як вядома, Войшэлак заснаваў манастыр пры ўпадзенні р. Валоўкі ў Нёман, там, дзе цяпер знаходзіцца в. Лаўрышава (на паўночны ўсход ад Новагрудка). Такім чынам, згодна з летапісам, на паўночны ўсход ад в. Лаўрышава за Нёманам, у кірунку Мінска знаходзілася Літва, што цалкам адпавядае летапісным звесткам 1159, 1162 гг. Калі б пад Літвою тут разумелася Аўкштайція, то летапісец ніяк не сказаў бы, што заснаваны Войшэлкам манастыр быў паміж Літвою і Новагародкам, бо Аўкштайція знаходзілася не ў паўночна-ўсходнім, а ў паўночна-заходнім накірунку" [29].

А.Краўцэвіч: "Для сваёй лакалізацыі Ермаловіч выкарыстаў сведчанні пісьмовых крыніц. Напрыклад, летапіс паведамляе, што ў 1159 г.

мінскі князь Валадар Глебавіч "хадзіў у лясах пад Літвой", а князь Войшэлак у 1262 г. заснаваў манастыр "на Нёмане між Літвою і Ноўгародкам." На аснове гэтых звестак даследчык размяшчае старажытную Літву між Новагародкам і Мінскам, што выглядае не надта пераканаўча" [30].

Э.Гудавічус: "Іпацьеўскі летапіс указвае, што Войшэлак заснаваў манастыр каля Нёмана, паміж Літвою і Новагародкам. Як і большасць аўтараў, М.Ермаловіч звязвае гэты манастыр з Лаўрышавам, што найбольш верагодна. Але што тут паказвае, быццам памянёная тут Літва цягнулася толькі да Бярэзіны? Слабасць гэтай сваёй аргументацыі адчувае і сам М.Ермаловіч, грунтуючы адно недаказанае сцвярджэнне на другім: Лаўрышава знаходзіцца на паўночным усходзе ад Новагародка, а тут жа змяшчаецца "старажытная Літва", якая не належыць да "балцкалітоўскіх земляў" і Аўкштайціі. Гэты аргумент мы ўжо разгледзелі, на іншых аўтараў спасылацца не будзем. Тым не менш, згадаем даследаванне Е.Ахманьскага, з якога высвятляецца, што літоўскія этнічныя межы праходзілі зусім недалёка ад Мінска. Такім чынам, і на паўночным усходзе ад Новагародка павінна знаходзіцца Літва" [31].

Каментар: – А.Краўцэвіч свой контраргумент супрацьпаставіў двум незалежным адзін ад другога аргументам М.Ермаловіча. Першы быў разгледжаны вышэй. Што тычыцца другога, то А.Краўцэвіч тут не заўважыў важную дэталь: манастыр знаходзіўся на месцы в. Лаўрышава, пра што сведчаць П.Бацюшкаў [32] і Т.Нарбут [33].

Згодна з летапісным паведамленнем, з аднаго боку манастыра (в. Лаўрышава) знаходзіўся Новагародак, з другога, процілеглага – Літва. Калі на дакладнай тапаграфічнай карце правесці лінію Новагародак – Лаўрышава і зрабіць яе працяг за Лаўрышава, то яна пройдзе праз Літву і далей цераз г. Заслаўе. Такім чынам, з летапіснага паведамлення выходзіць, што старажытная Літва знаходзілася паміж Лаўрышавам і Заслаўем.

Замена М.Ермаловічам в.Лаўрышава на Новагародак, а горада Заслаўя на блізкі Менск не мае прынцыповага значэння.

– Пытанне адносна таго, куды цягнулася Літва, да Беразіны ці іншага месца, не тычыцца разглядаемага паведамлення, таму яно М.Ермаловічам тут не даследавалася.

– Э.Гудавічус пагаджаецца з Е.Ахманьскім, паводле якога старажытная Літва таксама знаходзілася паблізу ад Менска. Трэба думаць, што ён пагаджаецца і з М.Ермаловічам, паводле якога старажытная Літва таксама знаходзілася недалёка ад Менска (паміж Менскам і Новагародкам). Але адначасова Э.Гудавічус угледзеў у аргументацыі М.Ермаловіча слабасць, якую ён (М.Ермаловіч) нібыта адчувае, і ідзе яна ад таго, што М.Ермаловіч грунтуе адно недаказанае сцвярджэнне на другім. Далей ідзе пералік гэтых неабгрунтаваных сцвярджэнняў.

Першае з іх – знаходжанне Лаўрышава ў паўночна-ўсходнім кірунку ад Новагародка. Картаграфічная служба зафіксавала в.Лаўрышава менавіта ў паўночна-ўсходнім кірунку ад Новагародка. Незразумела, чаму гэты факт з'яўляецца недаказаным сцвярджэннем М.Ермаловіча? Другое з іх – там жа (у паўночна-ўсходнім кірунку ад Новагародка) змяшчаецца "старажытная Літва". Зноў незразумела, чаму размяшчэнне Літвы, паводле летапіснага паведамлення, апошні лічыць таксама неабгрунтаваным сцвярджэннем М.Ермаловіча? На гэтыя пытанні Э.Гудавічус адказу не дае. Таму згадка пра слабасць аргументацыі, якую нібыта адчувае М.Ермаловіч, з'яўляецца "вынаходніцтвам" Э.Гудавічуса, пазбаўленым усякага сэнсу.

Такім чынам, згаданае прамое летапіснае паведамленне ў сукупнасці з інфармацыяй пра знаходжанне заснаванага Войшэлкам манастыра на месцы в.Лаўрышава дазваляе пераканаўча вызначыць месцазнаходжанне старажытнай Літвы на тэрыторыі сучаснай Беларусі, паміж гарадамі Менскам і Новагародкам.

3. М.Ермаловіч: "Летапісная Літва была не толькі на правым, але і на левым беразе Нёмана. У 1190 г. князь Рурык Расцілававіч вырашыў дапамагчы сваім родзічам – пінскім князям у барацьбе з Літвой і сабраўся ў паход на яе, але не здолеў туды дайсці, бо зрабілася цёпла і снег растаў, а ў гэтай балоцістай краіне толькі і можна ваяваць у моцныя халады. З гэтага можна зрабіць вывад, што Літва была недалёка ад Пінскай зямлі, за яе балотамі" [34].

Э.Гудавічус: "У 1190 г. кіеўскі князь Рурык пры падтрымцы пінскіх князёў рыхтаваў паход на Літву. З гэтага робіцца выснова, што "Літва была недалёка ад Пінскай зямлі, за яе балотам". Цалкам з гэтым пагаджаемся, застаецца толькі спытаць: што паказвае на тое, што гэтая Літва не прасціралася на поўнач і за Бярэзіну?" [35].

Каментар: Пра мяжу было ўжо сказана. Фрагмент з летапіснага паведамлення "...оць бо кго бяше пошелъ на Литву и бы в Пинески оу тещи своея..." [36] можна разглядаць як ускоснае сведчанне суседства Пінскай зямлі і Літвы.

4. М.Ермаловіч: "Іпацьеўскі летапіс пад 1246 г. паведамляе пра Літву, якая, зрабіўшы набег на Перасопіцу (на Валыні) вярталася праз Пінскую зямлю назад, дзе і была разбіта галіцка-валынскімі князямі. У наступным годзе "Літва" напала на Мельніцу і Лякоўню (таксама на Валыні) і зноў вярталася праз Пінскую зямлю, дзе таксама была разбіта. У 1262 г. атрады "Літвы", пасланыя Міндоўгам на валынскія гарады, адступалі: адзін у кірунку Ясельды, а другі да Небля, г.зн. у бок Пінскай зямлі, як і ў папярэдніх выпадках. Паколькі кожны раз зваротны шлях

"Літвы" праходзіў праз пінскую зямлю, то можна зрабіць вывад, што Літва знаходзілася дзесьці па суседству з ёю" [37].

Э.Гудавічус: "Зноў можна спытаць, чаму яны не маглі рухацца з больш аддаленых літоўскіх земляў?" [38].

Каментар: Маглі, але трэба мець на ўвазе, што не існуе ні аднаго летапіснага паведамлення пра рух Літвы з галіцка-валынскай зямлі на больш аддаленыя балцкія землі праз Навагародскую або Полацкую землі. Як і у папярэднім выпадку, тут мы маем ускоснае сведчанне пра суседства Літвы і Пінскай зямлі.

Заўвага: У тэксце М.Ермаловіча памылка, якую заўважыў Э.Гудавічус. Трэба чытаць "... з Лякоўніем...". Лякоўній – скажонае імя Ленгвена, кіраўніка літоўскага атрада.

5. М.Ермаловіч: Іпацьеўскі летапіс пад 1253 г. паведамляе як галіцка-валынскія князі, ідучы праз Пінск на Навагародак, сустрэлі на сваім шляху Літву: "И послаша сторожу Литва на озеро Зьяте и гнаша через болото до реки Щарье." Старожа звычайна высылалася для аховаў межаў краіны. З гэтага вынікае, што Літва знаходзілася дзесьці ў вярхоўі левага прытока Нёмана – Шчары. Гэтая Літва прыкрывала сабой Навагародскую зямлю з паўднёвага ўсходу, бо галіцка-валынскія войскі, перамогшы яе, "наутрея же плениша всю землю Новогородьскую" [39].

Э.Гудавічус: "У Іпацьеўскім летапісе пад 1253 г. апісваецца, што літоўцы паслалі разведчыкаў (старожу) пад воз. Зьяце, галічане гналі іх да Шчары, а на другі дзень спустошылі ўсю зямлю Навагародскую. Паводле М.Ермаловіча, гэта сведчыць, што старожа абараняла межы "старажытнай Літвы", а тая "старажытная Літва" з паўднёвага ўсходу прыкрывала Навагародак; перамогшы яе, галічане уварваліся ў Навагародскую зямлю. Але ж "Літва" ў тэксце – гэта не краіна, а людзі, і з тэксту вынікае, што трэба было выгнаць толькі разведчыкаў, каб трапіць у Навагародскую зямлю" [40].

А.Краўцэвіч: "Напрамую супярэчыць версіі Ермаловіча летапіснае апісанне паходаў галіцка-валынскага войска на Навагародак у 1251/52 і 1275 гг., якія вызначаліся падрабязнасцю і дакладнасцю геаграфічных дэталяў. Валынскія князі разлічвалі з'явіцца на Панямонні нечакана, але на воз. Зьяте сутыкнуліся з ліцьвінскім дазорам. Валыняне хутка прайшлі да Шчары, склікалі ваенную нараду, а "наутрея же плениша всю землю Новогородьскую". Адсюль вынікае, што там, дзе Ермаловіч бачыць Літву (як востраў балцкага насельніцтва), у сапраўднасці знаходзілася Новагародская зямля (у сярэдзіне XIII ст. Навагародская зямля, пэўна ўжо была часткай харонімa "Літва"). Гэтую летапісную інфармацыю, напэўна, можна разглядаць таксама, як сведчанне аб Навагародска-Пінскай мяжы па Шчары" [41].

У другім выданні сваёй працы "Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага" А.Краўцэвіч да сказанага вышэй дадае: "Часам Ермаловіч дэманструе элементарнае неразуменне сэнсу крыніцы. Так, каментуючы звестку пра паход галіцка-валынскага войска на Новагародак у 1253 г. (дакладна гэта было ў 1251/52 гг.), ён сцвярджае, што не валыняне гналіся за ліцьвінскім дазорам да Шчары, а, наадварот, "ліцвінская старожа гнала варожае войска да гэтай ракі" [42].

<u>Каментар</u>: Э.Гудавічус і А.Краўцэвіч літаральна ўспрынялі фрагмент летапіснага паведамлення: "Наутрея же плениша всю землю Новогородскую". Для даведкі: адлегласць ад месца на р.Шчары, дзе спынілася галіцка-валынскае войска, да Слоніма прыкладна 40 км, да Ваўкавыска – 95, Новагародка – 90, Гародні – 160 км. Усе яны належалі да Новагародскай зямлі. Нават пры сучасных камунікацыях і транспартных сродках "наутрея же пленить всю землю Новогородскую" немагчыма. Памянёны запіс – хутчэй за ўсе летапісны штамп.

На падставе згаданага літаральнага ўспрымання А.Краўцэвіч прыходзіць да высновы, што летапіснае апісанне напрамую супярэчыць версіі М.Ермаловіча. Таксама і Э.Гудавічус прыходзіць да аналагічнай высновы. Але падстава аказалася памылковай, таму меркаванні Э.Гудавічуса і А.Краўцэвіча страцілі свой пераканаўчы сэнс. Яны засталіся верагоднымі, як верагоднай застаецца і думка М.Ермаловіча, паводле якой Літва прыкрывала Новагародскую зямлю з паўднёвага ўсходу. Калі апаненты М.Ермаловіча абмежаваліся дэкларатыўнымі выказваннямі, то М.Ермаловіч, у адрозненне ад іх, абгрунтаваў сваю думку наяўнасцю ў разглядваемым раёне двух тапонімаў "Літва". Акрамя таго, як паведамлялася раней, у некаторых выпадках галіцка-валынскі летапіс называе Новагародскую зямлю Літвой. У разглядваемым паведамленні Новагародская зямля называецца сваім уласным імем. Гэта азначае, што "сторожа", якую пасылала Літва, была менавіта з Літвы.

Заўвага Э.Гудавічуса, што "Літва – гэта не краіна, а людзі, не супярэчыць сэнсу летапіса. Ці то паслала "сторожу" Літва ў сэнсе краіны, ці то гэта зрабіла яна ў сэнсе людзей, сама "сторожа" застаецца літоўскай.

Меркаванне А.Краўцэвіча, што ў сярэдзіне XIII ст. Новагародская зямля пэўна была часткай хароніма "Літва", не мае пад сабой ніякіх падстаў таму, што харонім падразумевае іншае напаўненне тэрміна "Літва", чым "Новагародская зямля" або "Літва ў вузкім сэнсе", якія ўжываліся ў крыніцах сярэдзіны XIII ст. і пазней. Таму з'яўленне хароніма "Літва" трэба аднесці на канец XIII – першую палову XIV ст.

Што тычыцца заўвагі А.Краўцэвіча пра дэманстрацыю М.Ермаловічам элементарнага неразумення сэнсу крыніцы, то тут трэба заўважыць, што М.Ермаловіч паўтарае думку Т.Нарбута, паводле якога літоўцы прагналі галіцка-валынскае войска ад возера Зьяте да р.Шча-

ры" [43]. Магчыма, тут М.Ермаловіч памыліўся. Таму да памылак трэба адносіцца спакойна як да непазбежных спадарожнікаў у навуковых і іншых працах.

Напрыканцы агляду згаданага летапіснага паведамлення трэба адзначыць, што яно ўвогуле з'яўляецца недастаткова інфарматыўным у сэнсе лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы як, напрыклад, разгледжанае раней паведамленне пра пабудову Войшэлкам манастыра. Тым не менш яго можна лічыць ускосным сведчаннем знаходжання Літвы паміж Навагародскай і Пінскай землямі.

6. М.Ермаловіч: "Запіс Іпацьеўскага летапісу пад 1255 г. даводзіць: "Данилови (Даніла Галіцкі) пошедшу на войну на Литву на Новогородок". Гэта значыць, што галіцкія войскі ішлі на Навагародак той жа дарогай, што і ў 1253 г., а менавіта праз Літву. Гэтыя факты, відаць, і мела на ўвазе Ф.Гурэвіч, калі зазначыла, што ў летапісных звестках пра Навагародак у 50–70 гг. XIII ст. "апавядаецца аб пранікненні галіцка-валынскіх князёў з Літвы ў гэты горад" [44].

Э.Гудавічус: "Пад 1255 г. Іпацьеўскі летапіс указвае, што галічане пайшлі на вайну, на Літву, на Навагародак. М.Ермаловіч угледзеў тут тую ж (і, вядома, знайшоў пацверджанне сваёй тэорыі) сітуацыю, як і ў 1253 г.: праз "старажытную" Літву ішлі на Навагародак. Але дзе сведчанне таго, што яны рухаліся не ў Літву, у Навагародак, які належаў Літоўскай дзяржаве?" [45].

Каментар: Як было згадана раней, галіцка-валынскі летапіс называе Навагародскую зямлю то сваім уласным імем, то Літвой. У гэтым месцы, магчыма, Навагародская зямля называецца Літвой.

7. М.Ермаловіч: "Характэрна, што на тэрыторыі, якая ў летапісах выступае пад назвай Літвы, да сённяшняга дня захаваўся тапонім "Літва"... Гэта карэнныя назвы, якія супадаюць з летапіснай назвай "Літва" і якія маюцца толькі ва ўказаным рэгіёне" [46].

Э.Гудавічус: "Дарэчы, на сваёй карце тэрыторыю "старажытнай Літвы" М.Ермаловіч абазначыў тапонімамі "Літва", якія, хутчэй за ўсё, сведчаць толькі пра пазнейшую славянізацыю гэтых ваколіц" [30].

Каментар: М.Ермаловіч не абазначае сваю карту тапонімамі "Літва", а толькі наносіць на яе вёскі, якія захавалі назву "Літва" да сённяшняга дня. Думка Э.Гудавічуса пра пазнейшую славянізацыю гэтых ваколіц (вёсак) слушная. Зараз там жывуць беларусы.

В.Насевіч: "М.Ермаловіч, мяркуючы, што гэтыя назвы акрэсліваюць асноўную тэрыторыю летапіснай Літвы, ігнаруе адзін з асноўных законаў тапанімікі: назву "Літва" вёска не магла мець там, дзе ўсе населеныя пункты літоўскія, а толькі ў іншамоўным асяроддзі. Дарэчы, пры такім

падыходзе летапісная Літва трапляе ў абшары неўрадлівых пясчаных глебаў, лясоў і балот, у тым ліку вялізнай Налібоцкай пушчы. Ядром этнасу, тым больш такога актыўнага, як старажытная Літва, гэтыя землі не маглі быць проста фізічна" [48].

Каментар: М.Ермаловіч як бы прадбачыў контраргумент В.Насевіча, калі выказаў думку, што: "У суседстве з Літвой, а то і ўперамешку з ёю жыло племя яцвягаў. Паколькі на гэтай тэрыторыі ёсць яцвяжскія гідронімы, а літоўскіх няма, то можна вывесці меркаванне, што яцвягі пасяліліся тут раней, а літва прыйшла сюды пазней і, заняўшы частку іхняй тэрыторыі, увесь час адціскала іх на захад. Як пераканаўча паказаў В.Сядоў, паселішчы яцвягаў былі паміж Нёманам і Вяллёй, на рэках Дзітве, Жыжме, Мерачанцы (гэта вобласць называлася Дайновай), а таксама па Свіслачы (Нёманскай. – А.П.), Росі, Зэльве, Заходнім Бугу, Нарэве, Ясельдзі (уласна Яцьвязь). У гэтых месцах засталіся археалагічныя помнікі яцвягаў – каменныя магілы" [49].

Пра тое самае мяркуе і М.Грынблат: "Старажытныя гуды – яцвягі аставілі сляды ў назовах населеных месцаў, якія сустракаюцца галоўным чынам у басейне Верхняга Нёмана і яго правых прытокаў. Тут да сёняшняга дня зберагліся назвы вёсак з каранём "гуд": Гуды ў Лідскім раёне, Гуды ў Валожынскім, Гуды на поўначы Івянецкага раёна, Гудзелі ў Радунскім раёне і гэтак далей. У гэтых месцах сустракаюцца і прозвішчы Гуд, Гудач, Гудовіч, Гудзіновіч, Гудзень" [50].

Н.Барсаў яшчэ у 80-х гадах XIX ст. указваў на яцвяжскія паселішчы IX–XI стст. у Верхнім Панямонні, якія аддзялялі рускія землі ад Літвы. Пазнейшым рухам усходніх славянаў з поўдня і ўласна Літвы з паўночнага ўсходу ў XII–XIII стст. частка яцвягаў была адціснута на паўночны захад, да Прускай азёрнай вобласці, а другая частка, застаўшаяся ў Панямонні, злілася са славянамі на поўдні і ўласна Літвой на поўначы [51].

Такім чынам, Літва займала не свабодныя землі, а землі, заселеныя яцвягамі. Гэтая тэрыторыя была для літоўцаў іншамоўнай, і, таму, нельга сказаць, што М.Ермаловіч ігнаруе адзін з асноўных законаў тапанімікі.

Што тычыцца неўрадлівых пясчаных глебаў, лясоў і балот, дзе жыла Літва ў XIII ст., то невядома, дзе сфарміраваўся такі актыўны этнас, як літоўскі. Паводле І.Ласкова, Літва прыйшла на тэрыторыю сучаснай Беларусі з басейну Дуная [52].

Але факт існавання вёсак з назвай "Літва" застаецца. В.Насевіч тлумачыць яго тым, што "адначасова са славянскай каланізацыяй Літвы самі літоўцы прасоўваліся на землі Панямонскіх княстваў (а магчыма, рускія князі сялілі іх там у якасці ваеннапалонных). Шэраг вёсак з назвай "Літва" ў вярхоўях Нёмана мае менавіта такое паходжанне" [53].

Тлумачэнне В.Насевіча, што літоўцы прасоўваліся на землі Панямоння, можна лічыць слушным. Але пасяленне літоўцаў у якасці ваеннапалонных супярэчыць меркаванню А.Краўцэвіча аб мірным суіснаванні літоўцаў і ўсходніх славянаў у згаданым рэгіёне [54].

А.Краўцэвіч: "Размяшчэнне тапонімаў "Літва" таксама не з'яўляецца дастаткова надзейным аргументам у такім дэталёвым раяніраванні. Яны маглі ўзнікнуць як перыферыйныя айконімы на мяжы гістарычных раёнаў ВКЛ "Літва" і "Палессе" [55].

У другім выданні працы "Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага" А.Краўцэвіч пашырае свой контраргумент. Ён піша: "Нельга лічыць выпадковым супадзенне паўднёвай і усходняй мяжы "Літвы Ермаловіча" з граніцай паміж харонімам "Літва" і аналагічнымі рэгіёнамі ВКЛ "Палессе" і "Русь", добра даследаванымі на XVI ст. Тапонімы "Літва", размешчаныя на гэтай граніцы, Ермаловіч выкарыстаў для сваёй лакалізацыі, пры гэтым без усялякіх падставаў і аргументаў аднёсшы названыя тапонімы выключна да XII–XIII стст., хоць не менш, а нават больш верагодна лічыць іх паказчыкамі мяжы між рэгіёнамі ВКЛ (пазней яна выступае як мяжа паміж гісторыка-этнаграфічнымі рэгіёнамі)" [56].

Каментар: Сцверджанне А.Краўцэвіча, што паўднёвая і ўсходняя межы Літвы Ермаловіча супадаюць з граніцай паміж харонімамі "Літва" і аналагічнымі рэгіёнамі ВКЛ "Палессе" і "Русь", а тапонімы "Літва", размешчаныя на гэтых межах, можна лічыць айконімамі, памылковае таму, што:

– межы Літвы Ермаловіча і паўднёвая і ўсходняя межы хароніма "Літва" не супадаюць паміж сабой за выключэннем невялічкага ўчастка на паўднёвым выгібу р. Шчары (гл. карту);

– калі адкарэкціраваць месцазнаходжанне тапонімаў "Літва" па дакладнай тапаграфічнай карце [57], то атрымаецца: два з пяці тапонімаў прылягаюць не да ўсходняй, а да заходняй мяжы Літвы Ермаловіча, два знаходзяцца ў яе цэнтры і яшчэ адзін – ва ўсходняй частцы згаданага рэгіёна, але далёка, прыкладна на адлегласці 50 км, ад мяжы хароніма "Літва" (гл. карту). Таму адсутнічаюць усялякія падставы лічыць згаданыя тапонімы айконімамі і паказчыкамі мяжы паміж часткамі ВКЛ;

– далей А.Краўцэвіч піша, што М.Ермаловіч без усялякіх падставаў і аргументаў аднёс названыя тапонімы выключна да XII–XIII стст., хоць не менш, а нават больш верагодна лічыць іх паказчыкамі мяжы паміж рэгіёнамі ВКЛ. М.Ермаловіч нідзе ў сваіх працах не дае храналагічнай прывязкі ўзнікнення тапонімаў "Літва". Трэба думаць, што частка з іх узнікла ў XII–XIII стст. пры засяленні літвой яцвяжскіх абшараў, частка магла з'явіцца пазней па нейкіх іншых прычынах, але абавязкова звязаных з літоўскім этнасам таму, што ні на сумежных, ні на аддаленых тэрыторыях такія тапонімы не выяўлены. Такім чынам адсутнічаюць уся-

лякія падставы адмаўляць апрабіраваную і шырока ўжываемую ў гістарычных даследаваннях практыку атаясамлення тапонімаў з рассяленнем аднайменных этнасаў.

Меркаванне М.Ермаловіча, што тапонімы "Літва" акрэсліваюць тэрыторыю старажытнай Літвы, пацвярджае Е.Ахманьскі, які лічыць іх прыналежнасцю карэннай літоўскай тэрыторыі [58].

8. М.Ермаловіч: "Для навукі мае прынцыповае значэнне высвятленне пытання, дзе была "Літва Міндоўга", бо менавіта з яе пачаўся працэс аб'яднання балцка-літоўскіх плямёнаў. У.Пашута паказваў яе ў Аўкштайціі, на тэрыторыі, якая ўключала гарады Вільню, Трокі, Кернаў, Дзялтуву, Укмерге. Але на гэтай самай карце ён змяшчаў (праўда, з пытальнікам) горад Варуту, дзе, як адзначана ў летапісе пад 1252 г., бараніўся Міндоўг ад сваіх супрацiўнікаў, на месцы сучаснага пасёлка Гарадзішча (Баранавіцкі раён), што вельмі далёка ад Аўкштайціі... Але ўся справа ў тым, што "Літва Міндоўга", як і ўся Літва, знаходзілася не ў Аўкштайціі, а ў Верхнім Панямонні, дзе і Варута. Ужо летапіснае паведамленне, што "Даниил возведе на Кондрата Литву Миндовга Изяслава Новогородского", дае зразумець, што "Літва Міндоўга" і Навагародак знаходзіліся блізка адзін ад другога. Відаць, гэта апошняе было прычынай таго, што Э.Гудавічус, які прысвяціў "Літве Міндоўга" спецыяльнае даследаванне і які лічыць, што яна знаходзілася на поўдні сучаснай Літвы, нават не ўказаў, дзе і ў якім кантэксце яна ўпамінаецца.

Блізкасць "Літвы Міндоўга" ад Навагародка дае магчымасць вызначыць (хоць прыблізна) месцазнаходжанне Варуты. Хаця яе атаясамліванне з сучасным Гарадзішчам не можа з'яўляцца бясспрэчным, аднак яно можа быць блізкім да ісціны. Мы са свайго боку пра месцазнаходжанне і назву Варута выказваем такое меркаванне. Між рэкамі Сэрвечу і Валоўкай ёсць невялічкая рэчка Рута і некалькі населеных пунктаў з такой назвай. Магчыма, на месцы аднаго з іх і знаходзілася Варута. У першапачатковай рэдакцыі летапіса, створанай, як меркаваў У.Пашута, у Навагародку, магло быць напісана, што Міндоўг "вниде во град во Руту". Паўтарэнне прыназоўнікаў характэрна для Навагародскага летапісу: "На реце на Немне", "за Домонтом за Нальшанским", "на Романа на Брянского". Пазнейшы рэдактар, устаўляючы Навагародскі летапіс у Галіцка-Валынскі, мог, не разабраўшыся, два словы "во Руту" прыняць за адно і, зрабіўшы іншыя рэдакцыйныя змены, напісаць "вниде во град именем Ворута". Магчыма, што Варута знаходзілася на месцы сучасных Карэлічаў, якія размешчаны на р. Рута і дзе ёсць гарадзішча" [59].

Э.Гудавічус: "Літва Міндоўга, паводле М.Ермаловіча, павінна быць абавязкова каля Навагародка, бо ў 1235 г. проці палякаў Даніла паклікаў Літву Міндоўга і Ізяслава Навагародскага. Калі так думаць, то Курск,

Пінск і Навагародак павінны быць блізка той каля таго, бо ў 1228 г. іх сілы дзейнічалі разам.

Высвятленне назваў Літвы Міндоўга і Варуты, несумненна, мае для навукі прынцыпіяльнае значэнне. Падкрэслім: трэба адрозніваць месцазнаходжанне самой Варуты, яе лакалізацыю і аргументы, якія для гэтага прыводзяцца. Згаджаючыся з адным, можна быць нязгодным з іншым і наадварот.

Мы не закранаем тут магчымасці лакалізацыі самой Варуты ў Верхнім Панямонні, разгледзім толькі аргументацыю М.Ермаловіча. Назву Варута ён звязвае з рэчкай Рута, што знаходзіцца ў акрэсленай ім "старажытнай" Літве. Таму з Рутай ён звязвае і Міндоўга (такой думкі прытрымліваюцца і іншыя), а склад "во" лічыць прыназоўнікам. Усе паслядоўнікі гэтай тэорыі не заўважаюць адной вельмі зразумелай рэчы: пры такім чытанні не дапасуюцца склоны. У тэксце – назоўны склон, а патрабуецца вінавальны. Таму ператварэнне Варуты ў Руту – гэта звычайнае непаразуменне, што ідзе ад няўмення скланяць рускі назоўнік і дапасоўваць яго да прыназоўніка" [60].

<u>Каментар</u>: Э.Гудавічус слушна заўважае, што агульныя дзеянні "Літвы Міндоўга" і Ізяслава Навагародскага супраць палякаў неабавязкова азначаюць, што яны былі блізкімі суседзямі. Але магчымасць блізкага суседства тут таксама не адмаўляецца.

Адносна пытання ператварэння Руты ў Варуту: няправільна будзе пераносіць сучасныя правілы рускай мовы на тэксты XIII ст. Калі ж тут М.Ермаловіч сапраўды памыліўся, то што з таго? На яго меркаванне пра магчымасць першапачатковай назвы Варуты – Рута такая памылка ніякім чынам не ўплывае. Таму звычайнага непаразумення тут не існуе, а меркаванне М.Ермаловіча застаецца адным з варыянтаў адказу на пытанне: дзе была сталіца Міндоўга Варута?

9. <u>М.Ермаловіч</u>: "Менавіта "Літву Міндоўга" разам з правабярэжнай Літвой і Нальшанамі ваяваў у 1258 г. татарскі ваявода Бурундай. Але Р.Батура мяркуе, што пад "зямлёй Літоўскай" у летапісе трэба разумець Навагародскае княства, якое нібыта належала Літве. Аднак ён не улічыў таго, што ў гэты час Навагародак не атаясамліваўся з Літвой, пра што сведчыць згаданае вышэй летапіснае паведамленне аб заснаванні Войшэлкам манастыра паміж Літвой і Навагародкам. У 1262 г. Міндоўг помсціў валынскаму князю Васільку за яго ўдзел у паходзе Бурундая нападам на валынскія гарады. Паказальна, што атрады "Літвы" і ў гэты раз адступалі праз Пінскую зямлю, што яшчэ раз сведчыць аб знаходжанні "Літвы Міндоўга" паміж Пінскай і Навагародскай землямі. З гэтага вынікае, што Бурундай мог ваяваць адзіную ў той час Літву, якая знаходзілася ў Верхнім Панямонні і з якой ён перайшоў у Нальшанскую

зямлю. Хоць апошняя пакуль што даследчыкамі дакладна не лакалізавана, аднак бясспрэчна, што яна, мяжуючы з Літвой, знаходзілася на паўночным захадзе сучаснай Беларусі. І калі Бурундай, рухаючыся з паўднёвага ўсходу, прайшоў праз Літву ў Нальшаны, то лівонцы і рыжане, якія рухаліся з паўночнага захаду, праз Нальшаны пранікл ў Літву. Гэта яскравае супадзенне ў паказаннях Іпацьеўскага летапіса і Лівонскай Рыфмаванай Хронікі – яшчэ адно відавочнае сведчанне, дзе была старажытная Літва" [61].

Э.Гудавічус: "М.Ермаловіч мяркуе, што Р.Батура "Літоўскую зямлю", куды ў 1258 г. наехаў Бурундай, неправільна называе Новагародкам (які належыць Літве). Р.Батура толькі падтрымлівае думку, што Бурундай ішоў з паўднёвага ўсходу на Новагародак (г.зн. праз Новагародак уварваўся ў Літоўскую зямлю). М.Ермаловіч бярэцца крытыкаваць літоўскі тэкст, не толькі не ведаючы літоўскай мовы, але нават добра не пазнаёміўшыся з літоўскім алфавітам (у ім даўно ўжо няма літары "w")" [62].

Каментар: Паводле М.Ермаловіча Новагародская зямля не магла называцца Літвой (у 1258 г.) таму, што ў 1262 г. ў тым жа галіцка-валынскім летапісе яна выступае пад сваім уласным імем. Але, як было згадана раней, А.Краўцэвіч заўважыў, што незалежна ад храналогіі ў згаданым летапісе Новагародская зямля называецца то сваім уласным імем, то Літвой. Таму, магчыма, што і тут Новагародская зямля называецца Літвой.

У летапісе азначаны землі, па якіх прайшоў Бурундай: гэта Галіцка-Валынская зямля, Літва, Нальшаны, Яцвяжская зямля, адкуль ён зноў прайшоў у Галіцка-Валынскую зямлю [63].

Спрачацца, што падразумеваць пад Літвой, уласна Літву або Новагародскую зямлю, не мае сэнсу таму, што летапіс не ўтрымлівае дастатковай інфармацыі, каб адназначна вызначыцца ў гэтым пытанні. Тым больш, што хутчэй за ўсё ад наезду Бурундая пацярпелі як Новагародская зямля, так і Літва, паводле М.Ермаловіча.

Цікава тут другое. Паводле Г.Лаўмянскага, старажытная Літва знаходзілася на тэрыторыі былога Трокскага княства (гл. карту). Бурундай на шляху з Нальшанаў да Яцвяжскай зямлі не мог абмінуць яе.

Але чаму галіцка-валынскі летапіс, у якім пералічаны ўсе землі, дзе праходзіў Бурундай, не згадвае пра Літву Г.Лаўмянскага? Ці не таму, што там яе не было?

З меркаваннем М.Ермаловіча, што Нальшанская зямля даследчыкамі дакладна не лакалізавана, нельга пагадзіцца. Г.Лаўмянскі, апіраючыся на крыніцы, пераканаўча лакалізаваў яе ў паўднёва-ўсходняй частцы арэала культуры ўсходне-літоўскіх курганоў.

Пры разглядзе канцэпцыі Г.Лаўмянскага мы сутыкнуліся з паведамленнем Рыфмаванай Хронікі, паводле якога лівонскае войска на шляху

да сядзібы Міндоўга – Варуты пасля спусташэння Нальшанскай зямлі перасекла яе і апынулася за межамі Літвы (durch Naesen kein Littoven).

На карце паказаны магчымы шлях лівонскага войска да сядзібы Міндоўга зыходзячы з інфармацыі ў Рыфмаванай Хроніцы. Тая акалічнасць, што войска прыкладна ў раёне Вільні павярнула не на поўнач, да Кернава, дзе Г.Лаўмянскі лакалізаваў Варуту і старажытную Літву, а на поўдзень, у Літву М.Ермаловіча, дае нам падставы меркаваць, што Рыфмаваная Хроніка пацвярджае яго канцэпцыю.

Сэнтэнцыя Э.Гудавічуса пра немагчымасць крытыкаваць літоўскі тэкст, не ведаючы пры гэтым літоўскай мовы, з аднаго боку дастаткова павярхоўная (існуе магчымасць перакладу), з другога – адлюстроўвае асабістую непрыязнь да апанента, што ў навуковай дыскусіі недапушчальна. Чытаць такое і нецікава, і непрыемна.

Акрамя вышэйзгаданых аргументаў М.Ермаловіч прыводзіць звесткі, якія не аспрэчваліся апанентамі і таксама сведчаць на карысць яго версіі:

– "У Нарбута мы чытаем аб тым, што ў 1405 г. тураўскі біскуп Антоній са згоды Вітаўта хрысціў у Літве народ у праваслаўную веру. Было незразумела, чаму менавіта тураўскі біскуп хрысціў Літву, якая, калі яе атаясамліваць з Аўкштайціяй, знаходзілася далёка ад Турава" [64].

– "Кіеўскі князь Яраслаў Мудры ў 1040 г. разбіў Літву на палях Слонімскіх і завалодаў ёю да Нёмана" [65].

– "Густынскі летапіс пад 1128 г. адзначыў, што Кіеўскі князь Мсціслаў паслаў свае войскі ў Літву да Ізяслаўля" [66].

Цікавы матэрыял на карысць версіі М.Ермаловіча прыводзіць М.Спірыдонаў у артыкуле "Літва" и "Русь" в Белоруссии в 16 в." Каб высвеліць, якую тэрыторыю жыхары ВКЛ у XVII ст. лічылі літоўскай, аўтар памянёнага артыкула правёў крапатлівую, але плённую працу ў архівах. Там ён знайшоў дваццаць дакументаў (тэстаменты, заявы-скаргі, інвентары, інструкцыі і г.д.), у якіх згадвалася аб прыналежнасці да Літвы згаданых там населеных пунктаў. Частка гэтых населеных пунктаў знаходзілася на тэрыторыі старажытнай Літвы паводле М.Ермаловіча, частка на прылеглых да яе тэрыторыях (гл. карту). Гэта населеныя пункты Менск, Узда, Навагародак, Дзярэчын, Паўловічы і інш. [66А]. На момант утварэння ВКЛ азначаныя населеныя пункты знаходзіліся на славянскай тэрыторыі, але памяць пра тое, што згаданыя тэрыторыі раней належылі Літве, была жывой і ў XVI ст. Такім чынам згаданыя архіўныя дакументы, у якіх прыводзяцца сведчанні жыхароў ВКЛ у XVI ст., можна лічыць як аргументы на карысць версіі М.Ермаловіча.

Апаненты В.Насевіч і А.Краўцэвіч прыводзяць аргументы, якія, на іх думку, адмаўляюць лакалізацыю старажытнай Літвы паводле М.Ермаловіча.

В.Насевіч: "Галоўнае ж, што на акрэсленай Ермаловічам тэрыторыі, як паказалі археалагічныя даследаванні, няма не тое што балцкіх, але практычна ніякіх археалагічных помнікаў, якія датаваліся б XIII ст." [67].

Каментар: "Паводле карты № 3 з працы А.Краўцэвіча "Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага", на тэрыторыі Літвы М.Ермаловіча, ў раёне г. Слоніма выяўлены балцкія помнікі №№ 80, 97, 104, 105, 113, 114, 115, 116, 117, 118, 119, у басейне р. Бярэзіны (Нёманскай) – помнікі №№ 94, 96, 108, у басейне р. Шчары – №№ 88, 107, 109. Усе помнікі – гэта каменныя магілы, акрамя № 88, які з'яўляецца былым гарадзішчам. Помнік № 88 датуецца XI–XIII стст., № 97 – XIV–XVI стст., астатнія помнікі не датаваныя.

Калі мець на ўвазе, што, паводле Н.Барсава, літва прыйшла на азначанае месца ў XII–XIII стст., то становіцца зразумелым, чаму там мала знаходзіцца археалагічных помнікаў XIII ст. Акрамя таго, увогуле археалагічныя помнікі X–XIV стст. у Верхнім Панямонні даследаваны вельмі слаба [68].

Але тое, што на нейкай тэрыторыі археалагічныя помнікі даследаваны вельмі слаба, не можа служыць падставай для адмаўлення лакалізацыі на ёй тэрыторыі нейкага народу, тым больш што лакалізацыя грунтуецца не па археалагічных, а па нейкіх іншых дадзеных.

Акрамя таго, І.Ласкоў, абапіраючыся на існуючыя археалагічныя матэрыялы, выказаў меркаванне (якое будзе разгледжана ніжэй) пра знаходжанне старажытнай Літвы ў раёне, вызначаным М.Ермаловічам.

А.Краўцэвіч: "У 1275 г. валынскае войска хуткім маршам ідзе каля Турава да Слуцка, потым "не дошедше ръкы Сыръвячъ" (каля 25 км ад Навагародка) стала на ноч. Гэта значыць яны праходзілі дакладна пасярэдзіне "Літвы" Ермаловіча і нават заначавалі ў ёй. Назаўтра, яшчэ да світання, перайшлі раку і пайшлі далей на Навагародак. Захапіўшы вакольны горад, валынскія князі "... сдумали ... тоже потомъ пойти в землю "Литовскую", але не пайшлі, а вярнуліся да дому. Гэта значыць удзельнікі паходу бачылі Літву не ў тым месцы, дзе яе лакалізуе М.Ермаловіч" [69].

Каментар: "Каб высветліць, у якім месцы бачылі Літву ўдзельнікі паходу, трэба звярнуцца да апісання гэтага паходу ў Іпацьеўскім летапісе, які паведамляе: "Тройдень, забыв согласие со Львом, послал городнян, велел захватить Дорогичин. С ним был Трид, он знал о городе, как его можно взять. Он выступил в поход ночью, и так они захватили город в самый день Пасхи и перебили всех от мала до велика. Узнав об этом, Лев очень опечалился и стал готовиться к войне, послал он к татарам, к великому царю Меньгу-Темиру, прося себе помощи у него против Литвы. Меньгу-Темир дал ему войско и с ним воеводу Ягурчина и дал ему в помощь заднепровских князей: Романа Брянского с сыном Олегом и Глеба Смоленского и иных князей много. Были тогда все князи в под-

чинении у татар. Когда наступила зима, стали собираться русские князья – Лев, Мстислав и Владимир. Пошли с ними и князья Пинские и Туровские... И так они пришли к городу и остановились около него. Мстислав не пришел, ибо он пошел от Копыля, воюя по Полесью, а также не пришли ни Роман, ни Глеб, князья заднепровские, один только Олег, сын Романа, пришел. Он пришел еще раньше с татарами. Татары очень хотели, чтобы Роман пришел.

А Лев обманул братьев своих – тайно от Мстислава и Владимира он вместе с татарами взял внешнее укрепление, а крепость осталась.

На другой день после взятия города пришли Роман Брянский и Глеб Смоленский, и иные многие князья – все они рассердились на него, что он не почел их за людей, равных себе, а сам взял город с татарами. Они задумали так, чтобы всем взять Новогрудек, а потом идти в землю Литовскую. Но, рассердившись на Льва, они не пошли и вернулись к себе" [70].

З запісу ў летапісе выходзіць, што паход аб'яднанага войска быў справакаваны захопам Дарагічына гараднянамі; што Леў прасіў у татарскага цара дапамогі "против Литвы". Гэта азначае, што ў летапісе Навагародская зямля, якой належала Гародня, называецца Літвой і, што калі б не здарылася сварка паміж удзельнікамі паходу, то наступным горадам для рабавання была б, хутчэй за ўсё, Гародня. Немагчыма нават уявіць, каб у той сітуацыі гараднянам даравалі захоп Дарагічына і забойства яго жыхароў. Наступны паход у 1277 г., калі "Валынскія князі зноў ідуць на Літву, а тут жа ўдакладняюцца канкрэтныя месцы Навагародак і Гародня" [4], пацвярджае, што ўдзельнікі паходу бачылі Літву ў Навагародскай зямлі.

А.Краўцэвіч слушна заўважыў, што ўдзельнікі паходу бачылі Літву не ў тым месцы, дзе яе лакалізуе М.Ермаловіч. Уся справа ў тым, што Літва для М.Ермаловіча – гэта этнічныя племянныя землі, а Літва для ўдзельнікаў паходу – Навагародская зямля.

Таму летапіснае паведамленне пра паход у 1275 г. ні ў якім разе не адмаўляе лакалізацыі старажытнай Літвы паводле М.Ермаловіча.

У другім выданні працы "Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага" А.Краўцэвіч прывёў некалькі новых заўваг адносна канцэпцыі М.Ермаловіча. Некаторыя з іх мы разглядалі раней, на астатнія звернем увагу зараз.

– "Ён (М.Ермаловіч. – А.П.) не прызнаў выкарыстаныя ім пісьмовыя сведчанні ўскоснымі, хоць усе тыя звесткі пра кірункі вяртання літоўцаў з паходаў, пра манастыр на мяжы Літвы і Новагародка і г.д. можна з такім жа поспехам аднесці і да лакалізацыі, прапанаванай аўтарам" [71].

Каментар: Так, А.Краўцэвіч мае рацыю, калі называе сведчанні пра кірункі вяртання літоўцаў з паходаў ускоснымі, што іх можна з

такім поспехам аднесці і да яго лакалізацыі Літвы. Але пры гэтым узнікае пытанне, чаму летапісы, якія згадваюць пра рух літвы праз Пінскую зямлю, ні аднаго разу не згадваюць пра рух літвы праз Навагародскую зямлю, праз якую яны абавязкова павінны былі прайсці пры вяртанні ў Літву паводле А.Краўцэвіча? Манастыр, які А.Краўцэвіч размясціў на мяжы Літвы і Новагародка, нельга "з такім жа поспехам аднесці і да лакалізацыі, прапанаванай аўтарам" таму, што ён (манастыр) знаходзіўся на месцы в.Лаўрышава (гл. каментар да аргумента, пазначанага № 2).

– "...для археолагаў размяшчэнне Літвы Ермаловіча ў раёне, бедным на ўмацаваныя паселішчы – гарадзішчы, выглядае непераканаўча, паколькі не стасуецца са значнай мілітарнай сілай гэтай вобласці, зафіксаванай пісьмовымі крыніцамі" [72].

Каментар: Адносна невялікая колькасць умацаваных гарадзішчаў яшчэ не азначае, што яны не стасуюцца з мілітарнай сілай гэтай вобласці. Паводле І.Ласкова, для большыні насельніцтва балотныя і лясныя нетры замянялі ім умацаваныя гарадзішчы пры небяспечных сітуацыях [73].

М.Ермаловіч вызначае межы старажытнай Літвы паводле летапісных дадзеных і тапаніміі. Мяжа на поўначы (прадмет цікавасці Э.Гудавічуса) з Полацкай зямлёй праходзіла па Бярэзіне. Пра Літоўска-Полацкае сумежжа тут сведчаць размешчаныя побач тапонімы "Літва" і "Палачаны". Па гэтай жа Бярэзіне ішла паўночна-заходняя мяжа Літвы з Нальшанамі [74]. Але калі лакалізаваць Нальшаны паводле Г.Лаўмянскага (гл. карту), то Літва будзе аддзелена ад іх Новагародскай зямлёй.

І.Ласкоў лічыць, што паўночная мяжа старажытнай Літвы "...заходзіла і на тэрыторыю сучаснай Летувы, на што паказвае тапаніміка ў Ашмянскім і Смаргонскім раёнах".

Аналізіруючы археалагічны матэрыял, ён заўважыў, што ў арэале культуры ўсходне-літоўскіх курганоў выразна прасочваюцца пахаванні каня побач з пахаваннямі чалавека. На поўдзень і паўднёвы ўсход ад згаданага арэалу пахаванні каня не выяўлены, але пахавальны інвентар быў аднолькавым з інвентаром усходне-літоўскіх курганоў. Пахаванні з канём І.Ласкоў звязвае з насельнікамі Нальшанаў і Дзяволтвы, а пахаванні без каня – са старажытнай Літвой" [75]. Аргументацыя згаданага вывада І.Ласковым займае значны аб'ём, таму яна тут не прыводзіцца, а зацікаўленыя чытачы адсылаюцца ў адпаведнасці са спасылкай да яго працы.

Такім чынам, вельмі верагодна, што на поўначы мяжа старажытнай Літвы праходзіла не па Бярэзіне, а па паўднёва-усходняй мяжы арэала

культуры ўсходне-літоўскіх курганоў, гэта значыць прыблізна па лініі Дзевянішкіс – возера Свір.

Падсумоўваючы ўсё сказанае вышэй, прыходзім да наступных высноў:

1. Прыведзеныя М.Ермаловічам звесткі з рускіх летапісаў і Рыфмаванай Хронікі:

– пра пабудову Войшэлкам манастыра паміж Новагародкам і Літвой;

– пра разгром кіеўскім князем Яраславам Мудрым Літвы ў наваколлі Слоніма;

– пра пасылку кіеўскім князем Мсціславам войска ў Літву да Ізяслаўля;

– пра паход лівонскага войска да сядзібы Міндоўга ў 1252 г.;

– а таксама размяшчэнне населеных пунктаў, якія прыводзяцца ў архіўных дакументах XVI ст. як літоўскія (паводле М.Спірыдонава), знаходжанне да сённяшняга дня вёсак з назвай "Літва" на акрэсленай М.Ермаловічам тэрыторыі

пераканаўча аргументуюць яго канцэпцыю лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы.

2. Ні адзін з прыведзеных апанентамі аргументаў і заўваг не адмаўляюць версіі М.Ермаловіча.

3. Нешматлікія памылкі М.Ермаловіча ў працы "Па слядах аднаго міфа" не маюць прынцыповага значэння і не ўздзейнічаюць на змест яго канцэпцыі.

4. Прыведзеныя ў п.1 аргументы пацвярджаюцца шлейфам ускосных звестак у пісьмовых крыніцах (пазначаных пп. 1, 3, 4, 6), што з'яўляецца зусім натуральным, і узмацняюць згаданыя аргументы.

## 2.6. Канцэпцыя В.Насевіча

В.Насевіч аргументуе сваю канцэпцыю выключна археалагічным матэрыялам. Паводле яго, "на жамойцкай тэрыторыі вызначаюцца выключна грунтавыя пахаванні без курганных насыпаў, на ўсходняй палавіне сучаснай Літвы і прылеглых частках Беларусі (г. Ліда, Налібоцкая пушча, воз. Нарач) пахаванні пад курганнымі насыпамі, бясспрэчна балцкімі паводле пахавальнага інвентару, але з выразнымі адрозненнямі ад грунтовых могільнікаў Жамойці. У Беларусі мяжа распаўсюджвання культуры ўсходне-літоўскіх курганоў прыкладна супадае з мяжой арэалу тыпова літоўскай тапанімії (вёсак з назвамі на -ішкі, -аны, -ены). Цэнтр яе знаходзіўся якраз там, дзе ўзніклі важнейшыя палітычныя цэнтры Літвы, – у раёне Кернава, Вільны, Трокаў. Адным словам, менавіта гэтую тэрыторыю трэба лічыць тэрыторыяй летапіснай Літвы, што пад-

раздзялялася на шэраг княстваў: Упіту, Дзяволтву, Нальшаны і, магчыма, нейкія іншыя" [76]... Самі літоўскія князі, а разам з імі крыжацкія храністы ў якасці сіноніма Літвы ўжывалі тэрмін "Аўкштайція" ці "Аўкштота" [77]... Так званая "Літоўская зямля ў вузкім сэнсе" займала, верагодна, міжрэчча Віліі і Нёмана" [78].

В.Насевіч згадвае пра выразнае адрозненне грунтовых магільнікаў Жамойці і пахаванняў пад курганнымі насыпамі ў арэале культуры ўсходне-літоўскіх курганоў. Але згаданае адрозненне не дае ніякіх падстаў для сцверджанняў, што тэрыторыю з пахаваннямі пад курганнымі насыпамі "трэба лічыць тэрыторыяй летапіснай Літвы". Такое сцверджанне патрабуе доказаў, якіх В.Насевіч не прыводзіць. Таму яго меркаванні пра лакалізацыю старажытнай Літвы ў міжрэччы Віліі і Нёмана застаюцца яго меркаваннямі і не болей таго.

## 2.7. Канцэпцыя А.Краўцэвіча

А.Краўцэвіч адзначыў, што "у лакалізацыі пачатковай (старажытнай. – А.П.) Літвы назіраецца нязгода гісторыкаў між сабой, як і між археолагамі і гісторыкамі. Паводле яго, між тым даволі лёгка параўнаць інфармацыю пісьмовых і археалагічных крыніц і прапанаваць лакалізацыю, якая не пярэчыць ні тым, ні іншым. Даследчыкі згаджаюцца, што пісьмовыя крыніцы дазваляюць размясціць Літоўскую зямлю на поўдні, Нальшанскую зямлю – на паўночным усходзе, а Дзяволтву – ў цэнтры Аўкштоты. Археалогія паказвае, што ўся гэтая тэрыторыя пакрывалася культурай усходне-літоўскіх курганоў. Калі прыняць за Літву паўднёвую частку Аўкштоты (ці арэала ўсходне-літоўскіх курганоў), то яна сапраўды межавала і з Мінскай, і з Навагародскай землямі.

Такім чынам застаецца актуальным прыблізна стогадовай даўнасці акрэсленне Літвы, зробленае Любаўскім – "вобласць правых прытокаў Нёмана, пераважна Віліі". Гудавічус, прааналізаваўшы пісьмовыя і археалагічныя сведчанні аб размяшчэнні асобных земляў Аўкштоты, прыйшоў да высновы: "сукупнасць памянутых дадзеных дазваляе ў нейкай ступені размежаваць паўднёвую і паўночна-ўсходнюю Аўкштоту і звязаць першую з Літвой у вузкім сэнсе, а другую з Нальшай" [79].

Каментар: Прызнаным аўтарытэтам у лакалізацыі балцкіх земляў з'яўляецца Г.Лаўмянскі (нягледзячы на яго памылкі ў лакалізацыі старажытнай Літвы). Пры лакалізацыі Нальшанскай зямлі ён абапіраўся на звесткі з Рыфмаванай Хронікі і іншыя матэрыялы. Але ў яго назіраецца разыходжанне паміж тэкстам і адлюстраваннем на карце, паводле якога Нальшанская зямля на карце размешчана ў паўднёва-ўсходняй частцы Аўкштайціі, у тэксце – у паўночна-ўсходняй частцы.

Памылка тут у тэксце таму, што:

– Г.Лаўмянскі асобна ў тым жа тэксце згадвае пра Ашмяны і Браслаў, якія, па яго думцы, уваходзілі ў Нальшанскую зямлю [80]. А гэта магло быць магчымым толькі пры ўмове размяшчэння Нальшанскай зямлі на паўднёвым усходзе Аўкштайціі;

– з Рыфмаванай Хронікі вынікае, што Нальшанская зямля цягнулася ад інфлянцкага памежжа далёка ў глыб Літвы (тут тэрмін "Літва" ужываецца ў сэнсе сукупнасці балцкіх земляў. – А.П.), да зямлі на левым беразе Віліі [11].

Якое канкрэтна месца Віліі маецца на ўвазе, Рыфмаваная Хроніка не паведамляе, але калі нават аднесці згаданы тэкст да любога месца на Віліі (на тэрыторыі Аўкштайціі), то тэрыторыя Нальшанскай зямлі будзе вызначацца ў паўднёва-ўсходняй частцы Аўкштайціі. Зразумела, што Г.Лаўмянскі ў лакалізацыі Аўкштайціі абапіраўся і на іншыя крыніцы.

Такім чынам, А.Краўцэвіч размясціў старажытную Літву там, дзе Г.Лаўмянскі лакалізаваў Нальшанскую зямлю.

Далей А.Краўцэвіч спасылаецца на Э.Гудавічуса, які "прааналізаваў пісьмовыя і археалагічныя сведчанні..." і прыйшоў да высновы пра размяшчэнне старажытнай Літвы на поўдні Аўкштайціі. Раней, пры разглядзе аргументацыі лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы паводле Г.Лаўмянскага, даследаваўся і "аналіз" Э.Гудавічусам згаданых пісьмовых і археалагічных сведчанняў. Тут мы абмяжуемся толькі вывадам з разгляду згаданага "аналіза": "Адвольны падыход (Э.Гудавічуса) да зместу крыніц дазваляе ўбачыць аргументы на сваю карысць нават там, дзе іх ніколі не было". Цытуемы вывад адносіцца да пісьмовых матэрыялаў. Што тычыцца археалагічных матэрыялаў, то па іх прыкладна таксама выказаліся археолагі А.Лухтан і В.Ушынкас.

А.Краўцэвіч як аргумент на карысць сваёй думкі паведамляе, што "калі прыняць за Літву паўднёвую частку Аўкштоты, то яна сапраўды межавала і з Мінскай, і з Навагародскай землямі". Незразумела, чаму межаванне Літвы з Мінскай і Навагародскай землямі з'яўляецца падставай для лакалізыцыі Літвы ў адзначаным А.Краўцэвічам месцы. У Іпацьеўскім летапісе пад 1262 г. паведамляецца пра пабудову Войшэлкам манастыра "межи" Навагародкам і Літвой. "Межи" ў перакладзе са старажытнарускай мовы азначае "паміж" [81], а не "на мяжы", як гэта памылкова пераклаў А.Краўцэвіч.

У адпаведным месцы артыкула, пры разглядзе аргумента М.Ермаловіча пад № 2, мы ўжо разгледзелі гэтае пытанне і выснову М.Ермаловіча, што старажытная Літва знаходзілася на месцы в.Лаўрышава, паміж Менскам і Навагародкам. Паўднёвая Аўкштайцыя, дзе А.Краўцэвіч размясціў старажытную Літву, не знаходзіцца паміж Менскам і Навага-

родкам, таму яго размяшчэнне супярэчыць паведамленню Іпацьеўскага летапіса пад 1262 г., якое сам А.Краўцэвіч лічыць аўтарытэтным" [82].

А.Краўцэвіч як яшчэ на адзін аргумент спасылаецца на М.Любаўскага, які сто гадоў таму зрабіў акрэсленне Літвы "у вобласці правых прытокаў Нёмана, пераважна Віліі".

Як згадвалася ў п.2,1, М.Любаўскі тэрмін "уласна літоўская зямля" аднёс да тэрыторыі Аўкштайціі, якая складалася з Нальшанскай зямлі і Дзяволтвы (гл. карту).

Апошні аргумент А.Краўцэвіча – археалагічны. "Археалогія паказвае, што ўся гэтая тэрыторыя (тэрыторыя, якую прапануе А.Краўцэвіч для лакалізацыі старажытнай Літвы. – А.П.) пакрывалася культурай усходне-літоўскіх курганоў". Думка, што тэрыторыя лакалізацыі старажытнай Літвы павінна абавязкова знаходзіцца ў арэале культуры ўсходне-літоўскіх курганоў, у шматлікіх даследчыкаў стала пастаяннай і, такім чынам, набыла рысы аксіёмы. Але ні адзін з іх не прывёў ні аднаго аргумента на карысць такой думкі.

А вось І.Ласкоў, пра што згадвалася раней, лічыць і знаходзіць на карысць сваёй думкі аргументы, што арэал культуры ўсходне-літоўскіх курганоў не сумяшчальны з тэрыторыяй старажытнай Літвы.

Падсумоўваючы сказанае вышэй, можна сцвярджаць, што А.Краўцэвіч, як і іншыя аўтары (Г.Лаўмянскі, Э.Гудавічус, А.Лухтан і В.Ушынкас, В.Насевіч), не прывёў ні аднаго надзейнага аргумента на карысць сваёй версіі. Таму яна, як і версіі згаданых аўтараў, застаецца неаргументаванай.

# 3. Заключэнне

Крытыка ўсіх канцэпцый дазволіла выявіць слабое месца ў бальшыні даследчыкаў. Усе аўтары, якія размясцілі старажытную Літву ў арэале культуры ўсходне-літоўскіх курганоў, сутыкнуліся з непераадольнымі цяжкасцямі пры абгрунтаванні сваіх канцэпцый. Напрыклад, В.Насевіч, А.Лухтан і В.Ушынскас падрабязна паведамляюць пра археалогію выбранага імі рэгіёна, але не прыводзяць ніводнага аргумента, які б пацвярджаў, што ў абраным імі рэгіёне знаходзілася старажытная Літва.

У адрозненне ад памянёных аўтараў Г.Лаўмянскі, Э.Гудавічус і А.Краўцэвіч спрабуюць аргуменціраваць свае канцэпцыі.

Пры дэталёвым разглядзе канцэпцый згаданых аўтараў была выяўлена беспадстаўнасць іх аргументацыі, таму яна не можа служыць асновай для лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы ў арэале культуры ўсходне-літоўскіх курганоў.

Тут нельга не адзачыць, што памяненыя вышэй аўтары з'яўляюцца высокапрафесіянальнымі гісторыкамі. Але дзіўная рэч, як толькі яны звяртаюцца да праблемы лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы, то адразу губляюць свой прафесіяналізм.

Напрыклад, чаму прафесіянал-гісторык Г.Лаўмянскі адвольна надаў зямлі, якая паводле Рыфмаванай Хронікі не мела ўласнай назвы, уласную назву Літвы ў цесным сэнсе і, такім чынам, "даказаў", што памяненая зямля і есць старажытная Літва? Чаму ён пайшоў на замену тэкста той жа Рыфмаванай Хронікі і там, дзе гаворка ідзе пра рух лівонскага войска за межы Літвы, ён паведамляе пра рух згаданага войска ў Літву і, такім чынам другі раз "абгрунтаваў" прапануемую ім лакалізацыю старажытнай Літвы на месцы былога Трокскага княства.

Чаму таксама прафесіянал – гісторык Э.Гудавічус з паведамлення Іпацьеўскага летапіса: "Потом Даниил послал много своих пеших воинов и всадников на их города, и они захватили все их вотчины и области" выводзіць, што паўднёвыя межы дамена Міндоўга акрэсліваліся гарадамі Меркіне, Даўгай, Варэны і Ліды? Прынцыпіяльна немагчыма з такога скупога на інфармацыю летапіснага паведамлення вызначыць канкрэтныя межы. Хібы такога кшталту характэрны і для А.Краўцэвіча (гл. апісанне яго канцэпцыі). Складваецца ўраджанне, што існуе нейкае табу на навуковы падыход пры асвятленні пытання лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы. М.Ермаловіч, хутчэй за ўсе, не ведаў пра гэтае табу і на прафесіянальным узроўні вырашыў згаданае пытанне, апіраючыся на Іпацьеўскі летапіс, Рыфмаваную Хроніку і іншыя даступныя крыніцы, пры гэтым ім была створана навукова абгрунтаваная канцэпцыя лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы. Так званыя "канцэпцыі" Г.Лаўмянскага (і Э.Гудавічу-

са), В.Насевіча, А.Лухтана і В.Ушынскаса і А.Краўцэвіча не маюць навуковага абгрунтавання і таму не могуць прэтэндаваць на статус навуковых канцэпцый. У выніку можна канстатаваць, што на сенняшні дзень існуе толькі адна навукова абгрунтаваная канцэпцыя лакалізацыі памянёнай Літвы – гэта канцэпцыя М.Ермаловіча.

Між тым, ў паўсядзённай практыцы гісторыкі час ад часу звяртаюцца да разглядаемай праблемы. Напрыклад, у сціслым энцыклапедычным артыкуле Г.Штыхава пра М.Ермаловіча падкрэслена ў пераліку яго асноўных дасягненняў і пытанне лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы [83]. Але сустракаюцца прыклады іншага падыходу да разглядаемай праблемы. У палеміцы паміж летувіскім гісторыкам А.Дубонісам і беларускім гісторыкам А.Краўцэвічам абодва не пагаджаюцца з высновай М.Ермаловіча [84], хоць для таго, каб пагадзіцца з ім, трэба зусім мала – уважліва прачытаць адпаведныя месцы ў працах Г.Лаўмянскага, Э.Гудавічуса. і М.Ермаловіча.

## Крыніцы


1. М.Ермаловіч. Па слядах аднаго міфа. – Мн.: Навука і тэхніка. – 1989. – С.21
2. E.Gudavicius. "Lietuvas" vazdas lla – 12a Ipuses saltiniuose // Lietuvas TSR Mokslu Akademijos darbai. A serija. – Vilnius, 1983, T. 3 (84). – P. 79–88
3. П.Урбан. Да пытання этнічнай прыналежнасці старажытных ліцьвінаў. – Мн.: 1994. – С. 35, 36
4. А.Краўцэвіч. Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага. – Мн.: Беларуская навука. – 1998. – С. 120
5. І.Ласкоў. Летапісная Літва: сваяцтва і лёс. – Рукапіс знаходзіцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (г. Мінск, шыфр 1Ба214823к). – С. 114
6. А.Кочубинский. Территория доисторической Литвы // Журнал министерства народного просвещения, 1897, январь. – С. 67, 91, 92
7. В.Седов. Дреговичи // Советская археология, 1963, № 3. – С. 117, 118
8. Я.Зверуго. Славяне и балты в междуречье Верхнего Днепра и Среднего Немана // Проблемы этничной истории балтов. – Рига, 1985. – С. 67
9. М.Любавский. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского статута. Исторические очерки. – М.: Университетская типография. – 1892. – С. 2
10. H.Lowmianski. Studja nad poczatkami spoteczenstwa i panstwa Litewskiego. T. 2. – Vilno, 1932. – S. 110
11. H.Lowmianski. Studja nad... – S. 106, 107
12. М.Любавский. Областное деление... – С. 2
13. H.Lowmianski. Studja nad... – S. 109
14. H.Lowmianski. Studja nad... – S. 109, 110
15. H.Lowmianski. Studja nad... – S. 110
16. H.Lowmianski. Studja nad... – S. 107
17. ПСРЛ Т. 2, стб. 818, 819
18. Э.Гудавичус. Литва Миндовга // Проблемы этногенеза и этнической истории балтов. – Вильнюс, 1985. – С. 224, 225
19. А.Лухтан, В.Ушинкас. К проблеме становления Литовской земли в свете археологических данных // Древности Литвы и Белоруссии. – Вильнюс, 1988. – С.91
20. Э.Гудавичюс. Литва Миндовга... – С.225
21. Там жа.
22. А. Лухтан, В.Ушынкас. К проблеме становления... – С. 103, 104

23. Мікола Ермаловіч. Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае. – Мн.: Беллітфонд, 2000. – С. 131
24. А.Краўцэвіч. Стварэнне... – С. 113
25. Апісанне земляў // Спадчына, № 6, 1993, с. 63–65
26. Карта «Балты в начале 13 в.». Литва. Краткая энциклопедия. Главная редакция энциклопедий. – Вильнюс, 1989. – С. 135
27. М.Ермаловіч. Па слядах... – С. 22
28. E.Gudavicius. Following the Tracks of a Myth // Lithuanian Historical Studies. – Vilnius, 1996. – S. 46
29. М.Ермаловіч. Па слядах... – С. 22
30. А.Краўцэвіч. Стварэнне... – С. 114
31. E.Gudavicius. Following… – S. 46, 47
32. П.Батюшков. Белоруссия и Литва. – СПб, 1890. – С. 60
33. T. Narbut. Dzieje narodu Litewskiego. T.4. – Wilno, 1838, – S. 184
34. М.Ермаловіч. Па слядах... – С. 22
35. E.Gudavicius. Following... – S. 47
36. ПСРЛ, Т.2, стб.672
37. М.Ермаловіч. Па слядах... – С. 22, 23
38. E.Gudavicius. Following... – S. 47
39. М.Ермаловіч. Па слядах... – С. 23
40. E.Gudavicius. Following... – S. 48
41. А.Краўцэвіч. Стварэнне... – С. 115
42. А.Краўцэвіч. Стварэнне ВКЛ. – Rzecow – 2000
43. T.Narbut. Dzieje narodu... – S. 163
44. М.Ермаловіч. Па слядах... – С. 23
45. E.Gudavicius. Following.... – S. 48
46. М.Ермаловіч. Па слядах.... – С. 24
47. E.Gudavicius. Following.... – S. 47
48. В.Насевіч. Пачаткі ВКЛ: падзеі і асобы. – Мн.: Полымя. – 1993. – С. 20
49. М.Ермаловіч. Старажытная Беларусь. – Мн.: Мастацкая літаратура. – 1990. – С. 17
50. М.Гринблат. К вопросу об участии литовцев в этногенезе белорусов // Вопросы этнической истории народов Прибалтики. – М., 1959. – С. 541
51. Н.Барсов. Очерки русской исторической географии. – Варшава, 1885. – С.234
52. І.Ласкоў. Летапісная Літва... – С. 200
53. В.Насевіч. Пачаткі ВКЛ... – С. 20
54. А.Краўцэвіч. Стварэнне... – С. 93
55. Там жа, с. 114
56. А.Краўцэвіч. Стварэнне ВКЛ. Rzeczow – 2000.– С. 121, 122

57. СССР. Топографические карты: №-25-XV: Молодечно, №-35-XXI: Столбцы, №-35-XII: Минск, №-35-XXVI: Слоним, №-35-XXVII: Барановичи
58. J.Ochmanski. Litewska granica… – S. 12
59. М.Ермаловіч. Па слядах... – С. 25, 26
60. E.Gudavicius. Following... – S. 48, 49
61. М.Ермаловіч. Па слядах... – С. 26
62. E.Gudavicius. Following... – S. 49
63. ПСРЛ Т. 2, стб. 847
64. М.Ермаловіч. Па слядах... – С. 23
65. Там жа, с. 28
66. Там жа, с. 43
66А. Спірыдонаў М.Ф. "Літва" и "Русь" в Беларуси в 16 в." // "Наш радавод", 1996, с.207, ч.7.
67. В.Насевіч. Пачаткі ВКЛ... – С. 20
68. А.Краўцэвіч. Стварэнне... – С. 86
69. Там жа, с. 115
70. ПСРЛ Т. 2, стб. 871, 872, 873, 874
71. А.Краўцэвіч. Стварэнне… – С. 121
72. А.Краўцэвіч. Стварэнне… – С. 122
73. І.Ласкоў. Летапісная Літва... – С. 112
74. М.Ермаловіч. Па слядах... – С. 24
75. І.Ласкоў. Летапісная Літва... – С. 286 – 305
76. В.Насевіч. Пачаткі ВКЛ... – С. 18, 19
77. Там жа, с. 20
78. Там жа, с. 21
79. А.Краўцэвіч. Стварэнне... – С. 116
80. H.Lowmianski. Studja nad... – S. 108
81. И.Срезневский. Материалы для словаря древнерусского языка. – СПб, 1895. – Т. 2. – С. 125
82. А.Краўцэвіч. Стварэнне... – С. 111
83. Вялікае княства Літоўскае. Энцыклапедыя ў 2 тамах. Том I. – Мн.: Беларуская энцыклапедыя. – 2005. – С. 619
84. А.Дубоніс. Краўцэвіч А.К. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага. – Мн.: Беларуская навука. – 1998 // Гістарычна альманах, том 5. – 2001. – С. 162.
85. А. Краўцэвіч. Дыскусія ці сварка? // Там жа, с. 168

# Лакалізацыя тэрыторыі старажытнай Літвы




- Межы балцкіх земляў паводле Г.Лаўмянскага
- Мяжа хароніма «Літва» паводле М.Спірыдонава
- Мяжа арэала культуры ўсходнелітоўскіх курганоў
- Сучасныя дзяржаўныя межы
- Мяжа старажытнай Літвы паводле М.Ермаловіча
- Мяжа старажытнай Літвы паводле А.Краўцэвіча
- Вёскі з назвай «Літва»
- Магчымы шлях лівонскага войска да сядзібы Міндоўга
- Літоўскія населеныя пункты паводле М.Спірыдонава

# Змест

1. Уступ ... 3

2. Канцэпцыі лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы ... 6

2.1. Меркаванне М.Любаўскага пра "ўласную Літоўскую зямлю" ... 6

2.2. Канцэпцыя Г.Лаўмянскага ... 6

2.3. Канцэпцыя А.Лухтана і В.Ушынскаса ... 11

2.4. Дублінскі летапіс ... 12

2.5. Канцэпцыя М.Ермаловіча ... 14

2.6. Канцэпцыя В.Насевіча ... 29

2.7. Канцэпцыя А.Краўцэвіча ... 30

3. Заключэнне ... 33

Крыніцы ... 35

А.Ц. Пухоўскі
Да пытання лакалізацыі тэрыторыі старажытнай Літвы

Адказны за выпуск – С.Л. Шаховіч.
Вёрстка – У.Б. Рахуба.

Падпісана да друку 16.05.2006 г. Фармат 60х84$^{1}/_{16}$
Гарнітура Таймс. Друк афсетны. Папера афсетная.
Ум. д. л. 2,32. Тыраж 100 экз. Заказ № 121/06.

Аддрукавана ў друкарні ЗАТ «Бонэм».
ЛП №02230/0056646 ад 27.03.2004 г.
ЛВ №02230/0056944 ад 01.04.2004 г.
220123, Мінск, вул. Старавіленская, 100. Тэл./факс: 289-51-57.